

ЗАДАЧЫ ДЛЯ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ **4**

«БОЛЬШ, ЧЫМ КНІГІ» **8-9**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 ЛЮТАГА 2019 г. АЎТОРАК № 28 (28895)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ЖУКАВА, намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі:**

*«Як чакаецца, сезонны ўздым захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі ў хуткім часе пойдзе на спад, ён прадоўжыцца яшчэ тыдні два. Цяперашні ўзровень, калі рэгіструецца пік захваральнасці на ВРВІ і грып, характэрны для гэтага перыяду. У некаторых рэгіёнах, напрыклад, у Брэсцкай вобласці, захваральнасць ніжэйшая за сярэдні ўзровень па краіне, у Гомелі — крыху вышэйшая. У цэлым сітуацыя прагназуемая і кантралюемая. Па выніках эпіднагляду, у пікавыя тыдні вірус грыпу сустракаецца не больш як у 20 працэнтаў усіх захварэлых. У гэтым сезоне прышчэпкі супраць грыпу атрымалі крыху больш за 40 працэнтаў беларусаў. Менавіта вакцынацыя — надзейны спосаб абароны ад грыпу, а таксама цяжкіх формаў рэспіраторных захворванняў».*

# ЛЫЖНЫЯ ВЫХАДНЫЯ

## Канец мінулага тыдня быў насычаны спартыўнымі спаборніцтвамі

**Субота і нядзеля атрымаліся не па-зімоваму гарачыя: больш за пяць тысяч чалавек адправіліся ў сталічную Вяснянку і прынялі ўдзел у спартыўным свяце «Мінская лыжня — 2019».**

Акрамя захапляльных спартыўных баталій, для шматлікіх гледачоў падрыхтавалі культурна-забаўляльную праграму, а таксама гарачыя напоі і харчаванне. Дарэчы, у эстафеце прыняў удзел Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, сваім прыкладам паказаўшы, як можна з карысцю праводзіць вольны час узімку.



Фота БелТА.



Фота Андрэя САЗОНАВА.

...У спартыўным комплексе «Раўбічы» тым часам змешанымі эстафетамі ў трох узроставых катэгорыях завяршыліся рэспубліканскія спаборніцтвы па біятлоне «Снежны снайпер».

За ходам гэтых мерапрыемстваў прасачылі нашы карэспандэнты. Рэпартажы — у сённяшнім нумары.

*(Працяг тэмы на стар. 2, 13)*

## КОРАТКА

- **У красавіку гэтага года ў парламент краіны плануецца ўнесці праект закона аб персанальных даных.**
- 175 206 мінчан-пенсіянераў (36,3 % з агульнай колькасці, звесткі на пачатак лютага) працягваюць працоўную дзейнасць.
- **Падчас праверкі Узброеных Сіл з запасу прызвалі каля 1,4 тысячы ваеннаабавязаных.**
- Паводле звестак МУС самае распаўсюджанае кіберзлачынства ў Беларусі — узлом акаўнта ў сацыяльных сетках.



ISSN 1990 - 763X

## Вернісаж. Памяць сэрца

*Сёння «Звязда» пачынае новы праект сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем Беларусі — «Вернісаж. Памяць сэрца», дзе гаворка пойдзе пра мастацкія творы часоў Вялікай Айчыннай, або прысвечаныя ёй, у тым ліку работы аўтарства беларускіх мастакоў — франтавікоў і ўдзельнікаў партызанскага руху. З каго пісалі партрэты ваенныя мастакі, якія сюжэты выбіралі і з дапамогай якіх прыёмаў і сродкаў перадавалі пэўны настрой у сваіх работах? Ці ўсё мы ведаем пра знакамітыя карціны, што захоўваюцца ў музейных фондах, прычым не толькі ў нашай краіне? Угледзімся і абмяркуем падрабязнасці разам з мастацтвазнаўцамі.*

Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

# ГАЛЕРЭЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

**У гісторыі розных краін ёсць такія падзеі, якія незалежна ад таго, што адбывалася, як мянялася палітычная сістэма або эканамічны лад, грамадства і людзі, нібы стрыжань праходзяць праз час і назаўсёды застаюцца ў непарушнай народнай памяці. У ліку такіх падзей — Вялікая Айчынная вайна, якая на многія дзесяцігоддзі пакінула незагойныя раны ў гісторыі ўсёй нашай краіны і практычна ў кожнай беларускай сям'і...**

**СТАР. 5**



**Яўген Аляксеевіч Зайцаў (1908—1992). «Партрэт юнага партызана». 1943 г. Палатно, алей.**

# НЕ НАЗІРАЙ, А ЎДЗЕЛЬНІЧАЙ!

## Як праходзіла зімняе спартыўнае свята «Мінская лыжня»

**Надвор'е не падвяло: суботняй раніцай на лыжаролернай трасе было ў меру марозна, выдатнае надвор'е для катання на лыжах захоўвалася на працягу ўсяго дня.**

Першы старт быў дадзены аб 11-й гадзіне. У эстафетнай гонцы 4х3 км удзельнічалі каманды Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, Вярхоўнага суда, Канстытуцыйнага суда, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, Палаты прадстаўнікоў, Нацыянальнага алімпійскага камітэта, СМІ — усяго 20 квартэтаў. Дарэчы, перамогу атрымала каманда кіраўніка дзяржавы. Аднак што казалі ўдзельнікі спаборніцтваў перад пачаткам?

Як адзначыла **знакамітая беларуская біятланістка Надзея СКАРДЗІНА**, «Мінская лыжня — 2019» стала для яе сюрпрызам, паколькі пра маючыя адбыцца спаборніцтвы яна даведалася літаральна за некалькі дзён да пачатку, а рыхтавалася да пазнейшых дат. «Гэта будзе такая добрая размінка. Але наогул ёсць хваляванне, таму што я ўжо даўно не страляла з ходу, страляла толькі ў спакойным стане. Але гэта надзвычайна — я ўжо забылася, што такое біятлонныя спаборніцтвы, і вельмі рада тут быць, таму што спаборніцтвы для мяне заўсёды былі радасцю і святам», — адзначыла яна.

На думку спартсменкі, у кожных спаборніцтвах галоўнае — удзел, але медаль — гэта яшчэ лепш. Яна падкрэсліла, што бегчы заўсёды трэба на поўную сілу. «Мне здаецца, я ніколі не бегала не ў поўную сілу», — дадала Надзея Скардзіна.

**Заслужаная артыстка Беларусі Іскуі АБАЛЯН** перад стартам трохі хвалявалася, паколькі ўпершыню прымала ўдзел у падобным спаборніцтве.

«Галоўнае, каб нам цяпер расказалі, куды паварочваць на гэтай лыжні. І розніцу сілы, каб усё гэта правільна зрабіць. Мы прывыклі па навігатары перамяшчацца, але на лыжні людзі будуць наперадзе — галоўнае ад іх не адстаць», — пажартавала яна.

Што складаней: выступаць на сцэне ці ўдзельнічаць у біятлоннай гонцы? У адказ на гэтае пытанне спявачка заклікала не параўноўваць розныя паняцці, пасля чаго неадкладна пабегла на старт.

Імправізаванае інтэрв'ю працягнуў **артыст Іван ВАБІШЧЭВІЧ**: «Што самае складанае ў біятлоне? Самае складанае — не ўбачыць побач з сабой Дар'ю Домрачаву. Таму што калі ты ўбачыў яе побач, то ў прынцыпе разумееш, што спрабаваць уклініцца ў лыжы — ну куды?»

...Літаральна за секунды да старту гонкі **знакамітая беларуская біятланістка Дар'я ДОМРАЧАВА** адзначыла, што для яе вельмі адказна прадстаўляць каманду Прэзідэнта. Яна звярнула ўвагу на выдатную атмасферу, а таксама падкрэсліла, што бегчы нялёгка, паколькі траса, нягледзячы на невялікую адлегласць, даволі няпростая. «Раўніна, пакаты пад'ём — усю дыстанцыю трэба працаваць на максімум, а паколькі гэта эстафета, то ўдвая адказней, таму што ты прадстаўляеш не толькі сябе, але і каманду», — сказала яна.

...Прадоўжылася свята ў 12.20 біятлоннай гонкай з масавага старту на 1,5 км сярод жанчын. Забег атрымаў назву «Узыходзячыя зоркі».

**Міс Беларусь Марыя ВАСІЛЕВІЧ** расказала, што на лыжы стала менш за месяц таму, за ўвесь час у яе было 5—6 трэніровак. «Вядома, цяжка даецца, але будзем браць упартасцю, сілай. Слабая, вядома, у мяне зараз тэхніка, але я ўсё роўна думаю, што ўсё будзе выдатна», — адзначыла яна.

Што складаней: рыхтавацца да конкурсу прыгажосці ці да біятлона? У адказ на гэта пытанне Марыя Васілевіч заявіла, што да дэфіле ёй як мінімум больш звыкла рыхтавацца, але да лыжні — шмат цікавей. «Эмоцыі тут будуць дакладна ярчэйшыя, чым на конкурсе прыгажосці, — дадала Міс Беларусь. — Страляю я добра. Ну, калі не хвалюючыся *(смяецца)*. Нідзе не вучылася, літаральна месяц таму пачала, але ў мяне тата ваенны, можа быць, гены».

Пазней адбылося яшчэ некалькі стартаў: эстафета і забег сярод камандаў сілавых міністэрстваў і ведамстваў, старт зборных ВНУ і масавы старт у лыжных гонках.

### У беларусаў будуць добрыя лыжы

Пасля ўзнагароджання кіраўнік дзяржавы пагутарыў з журналістамі — вядома ж, пра спорт.

На пытанне аб тым, ці змогуць беларускія вытворцы лыжаў скласці канкурэнцыю сусветным, Аляксандр Лукашэнка адказаў наступнае: «Я вам абяцаю, што ў нас будуць добрыя лыжы. Вядома, для такога ўзроўню, як Даша Домрачава або Надзя Скардзіна, мы будзем выбіраць з сотняў пар вядучых лыжных фірмаў адны лыжы».

Беларускі лідар расказаў пра ўласны досвед падбору лыжаў: улетку ён папрасіў вядомага замежнага вытворцу зрабіць лыжы спецыяльна пад сябе. У выніку кіраўнік дзяржавы атрымаў лыжы не толькі ад гэтай кампаніі, але і ад яе даччынага прадпрыемства ў падарунак — сумарна дзясятак пар. Пасля гэтага Аляксандр Лукашэнка перадаў іх спецыялістам і айчынным спартсменам на этап Кубка свету і папрасіў выпрабаваць, каб адабраць найлепшую пару.

«З дзесяці пар адну выбралі. І тое, кажуць, гэта найлепшая, але не самая добрая», — падкрэсліў ён.

Акрамя таго, усё залежыць ад мэт лыжніка — хтосьці катаецца на вынік, хтосьці — для здароўя. Дарэчы, на «Мінскай лыжні» Прэзідэнт быў вымушаны змяніць лыжы, паколькі першая пара «не пайшла».

«Лыжы — гэта не так проста стварыць і дацягнуцца да самай верхатуры. Я такой задачы перад спецыялістамі не ставілю. Нам трэба лыжы для таго, каб падрыхтаваць спартсменаў. А падрыхтаваўшы спартсмена, тым больш вялікага, як нашы дзяўчынкі Дашка (Домрачава. — **«Зв.»**) і Надзя (Скардзіна. — **«Зв.»**), мы ім купім і па тысячы пар, і абяром найлепшыя, толькі галоўнае, каб яны бегалі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар зноў падкрэсліў: лыжы мы зробім — гэта не пытанне. Пытанне ў часе — гэта адзін год. «Да наступнай зімы мы будзем мець добрыя лыжы, чаравікі — зрабілі, палкі — зрабілі, усё — зрабілі. «Марко» мне перадалі чаравікі — выдатныя. Першыя забракаваў, другую пару перадалі — выдатныя. Трымаюць добра лыжу, малайцы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, лыжы для пачаткоўцаў у нас ёсць, неабходна зрабіць іх для сярэдняга ўзроўню і вышэйшага, каб падрыхтаваць спартсменаў. «Мы гэтыя лыжы зробім. А пакуль закупілі лыжы недарагія, тое, што мы не можам зрабіць, 13 тысяч пар. Ужо забяспечылі ўсіх», — сказаў ён.

Але бяда яшчэ ў тым, дадаў кіраўнік дзяржавы, што масавы спорт развіваецца недастаткова актыўна — не імкнуцца катацца на лыжах, асабліва гэта датычыцца школ і моладзі. «Хіба гэта нармальна? Лыжы дай, скажы, што гэта добра, а потым яшчэ і за руку цягні на трасу. Што за бацькі, я не разумею. Дзяцей трэба абавязкова выхоўваць у гэтым плане — менш хварэць будуць, гэта факт», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

На пытанне аб тым, як ён мяняў распарадак дня для падрыхтоўкі да «Мінскай лыжні», Прэзідэнт адзначыў, што гэта яго звычайнае жыццё і на лыжах ён бегае з дзяцінства. «Ну а зараз я проста абавязаны гэта рабіць, каб іншыя следам бегалі. Таму не, нічога не мяняў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Ну так, хакей адмянілі апошнія два тыдні і займаліся толькі лыжамі».

Беларускі лідар звярнуў увагу, што асабісты прыклад бацькоў вельмі важны, і адзначыў, што яго дзеці таксама катаюцца на лыжах. Дарэчы, малодшы сын кіраўніка дзяржавы Мікалай удзельнічаў у гонцы ў складзе каманды Прэзідэнта.

### Для гасцей грошай не шкадаваць

Апошняе пытанне кіраўніку дзяржавы: ці прыносіць стаўка на спорт сувымерныя дывідэнды — асабліва ў кантэксце маючых адбыцца Еўрапейскіх гульняў. У адказ Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: такія мерапрыемствы значна ўплываюць на імідж на міжнароднай арэне, бо людзі, якія раней мала што чулі пра Беларусь, сапраўды дзівяцца прыгажосці нашай краіны. «Я думаю, яны (турысты і заўзятары. — **«Зв.»**) тройчы ахнуць (калі прыедуць у Беларусь летам. — **«Зв.»**). За гэта, за імідж краіны, за сапраўдны піяр краіны цяпер плацяць сотні мільёнаў долараў. Мы нічога не плацім — мы паклікалі людзей, накармілі, напаілі, спаць паклалі», — адзначыў ён.

Таксама ён расказаў аб будучым лёгкаатлетычным матчы зборнай Еўропы і ЗША, які пройдзе ў Беларусі. Прэзідэнт адзначыў, што марыў пра гэта, прасіў кіраўніка Міжнароднай Федэрацыі лёгкай атлетыкі прывезці ў Беларусь такі матч. «Вы ўяўляеце, якое гэта будзе свята! Гэта не ніжэй за ўзровень, чым Еўрапейскія гульні. Таму тое, што да нас едуць людзі, тое, што яны з'язджаюць заўсёды з добрым настроем, тое, што яны захоплены нашай краінай, — пагадзіцеся, гэта нават не сотні мільёнаў долараў, гэта ўжо мільярды. Гэта інвестыцыі, можа быць, не ў нас з вамі, мы ўжо паглядзелі з вамі свет. А вось для нашых дзяцей, унукаў, гэта вялікі падмурак — няхай толькі яны гэтым скарыстаюцца», — дадаў ён.

Прэзідэнт рэзюмаваў: не трэба шкадаваць грошай, каб запрасіць да сябе гасцей.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Афіцыйна

## ДВА РАЎНДЫ ПЕРАГАВОРАЎ

**На гэтым тыдні адбудуцца дзве сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі — 13 і 15 лютага.**

У сераду, 13 лютага, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін у Сочы разгледзяць пытанні двухбаковага супрацоўніцтва і інтэграцыі на еўразійскай прасторы.

Учора прэс-служба Прэзідэнта Расіі анансавала яшчэ адзін раўнд перагавораў (15 лютага) у рамках візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Расію. У фокусе ўвагі гэтым разам — паглыбленне супрацоўніцтва ў культурна-гуманітарнай сферы. На сустрэчы таксама будуць прысутнічаць міністры дзвюх краін, адказныя за адукацыю, культуру і спорт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Італьянскія прафсаюзы правялі найбуйнейшую акцыю пратэсту



Дэманстрацыя ў Рыме сабрала сотні тысяч удзельнікаў. Такія ацэнкі прыводзіць «Франс-Прэс». Пад лозунгам «Будучыня — працы» выйшлі на вуліцы Рыма найбуйнейшыя прафсаюзы Італіі: CGIL (Усеагульная італьянская канфедэрацыя працы), CISL (Італьянская канфедэрацыя прафсаюзаў працоўных) і UIL (Італьянскі саюз працы), паведамляе ilgiornale.it. Удзельнікі акцыі абвінавацілі ўрад у недастатковай рашучасці пры правядзенні сацыяльна-эканамічных рэформаў. Яны запатрабавалі выдзеліць больш сродкаў на праграмы павелічэння занятасці і на пенсійную сістэму, а акрамя таго крытыкавалі ўлады за пагрозу рэцэсіі. Да прафсаюзаў далучыліся прадстаўнікі асацыяцыі прамыслоўцаў Confindustria, якія таксама крытыкуюць меры ўрада і патрабуюць забяспечыць вялікія інвестыцыі ў эканоміку краіны. Гэтую акцыю называюць найбуйнейшай з пачатку 2015 года, калі краіну ахапілі пратэсты супраць змяненняў у закон аб працы. Для ўдзельнікаў дэманстрацыі, якія прыехалі ў Рым на мінулыя выхадныя з розных рэгіёнаў Італіі, выдзеліліі 12 спеццягнікоў, чартарныя рэйсы і каля 1300 аўтобусаў.

### Апазіцыя ў Тайландзе адмовілася вылучаць прынцэсу на пасаду прэм'ера



Апазіцыйная партыя «Тхаі Ракса Чаат» адмовілася ад вылучэння прынцэсы Убол Рата ў якасці кандыдата на пасаду прэм'ер-міністра Тайланда. Гэта рашэнне было прынята пасля рэзкай крытыкі з боку караля, які заявіў, што члены каралеўскай сям'і павінны заставацца ўбаку ад палітыкі. «Удзел члена каралеўскай сям'і ў палітыцы, усё роўна ў якой ролі, будзе ўспрыняты як непавага да традыцый і культуры краіны», — адзначыў Маха Вачыралонгкорн. У партыі заявілі, што падпарадкоўваюцца жаданню караля, які асудзіў рашэнне сваёй сястры Убол Рата. Выбары ў Тайландзе прызначаны на 24 сакавіка. Да іх прыкавана ўвага сусветнай грамадскасці, таму што яны даюць краіне шанц вярнуцца да дэмакратыі пасля пяці гадоў ваеннага праўлення.

### З-за нашэсця белых мядзведзяў на архіпелагу Новая Зямля ўвялі рэжым надзвычайнай сітуацыі



Як паведамляюць мясцовыя ўлады, дзікія жывёлы масава шпацыруюць у небяспечнай блізкасці ад населеных пунктаў. Па словах кіраўніка муніцыпалітэта Новая Зямля Жыганшы Мусіна, рэжым надзвычайнага становішча ўводзіцца без абмежавання па часе — да той пары, пакуль не будзе забяспечана бяспека мясцовага насельніцтва. «Я на Новай Зямлі з 1983 года, але ніколі раней такога масавага нашэсця белых мядзведзяў не было», — заўважыў Мусін. Асабліва складаная сітуацыя ў пасёлку Белушая Губа, дзе налічылі 52 белыя мядзведзі. Па словах чыноўнікаў, былі і скаргі на агрэсіўныя паводзіны жывёл: яны нападаюць на людзей і пранікаюць у жылыя і службовыя памяшканні. «Людзі напалоханыя, баяцца выходзіць на вуліцы», — адзначаецца ў афіцыйным паведамленні. У адміністрацыі заяўляюць, што атрымалі ад жыхароў, работнікаў школ і дзіцячых садкоў мноства заяў з патрабаваннем забяспечыць бяспеку. Па афіцыйнай інфармацыі, для абароны людзей ужо ўсталёўваюць дадатковыя загароды ў дзіцячых садках, прыняты меры для бяспечнай перавозкі дзяцей, а таксама ваеннаслужачых і работнікаў прадпрыемстваў. Аднак мядзведзяў гэта не адпуджвае. Яны прывыклі нават да святлашумавых сігналаў і аўтамабіляў, а некаторыя асобіны нападаюць на аўтатранспарт. Для ацэнкі сітуацыі з Архангельска накіравалі на Новую Зямлю аператыўную групу спецыялістаў.

Жыллё маё

# АДМЯНЯЕЦЦА ДЫФЕРЭНЦЫЯВАНАЯ ПЛАТА ЗА НЕКАТОРЫЯ КАМУНАЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ

**Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 9 лютага 2019 года № 81.**

Так, у нашай краіне адмяняецца дыферэнцыяваная плата за тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў, паслугі водазабеспячэння, водаадвядзення, а таксама электрычную энергію ў залежнасці ад аб'ёмаў спажывання, адзначаецца на сайце Савета Міністраў Беларусі.

Пастановай уводзіцца новая група спажыўцоў электрычнай энергіі, жылыя памяшканні якіх абсталяваны асобнымі прыборамі індывідуальнага ўліку расходу электрычнай энергіі і стацыянарна ўсталяванымі або ўбудаванымі прыёмнікамі электрычнай энергіі для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння (пры адсутнасці цэнтралізаванага цепла- і газазабеспячэння з аплатай за электраэнергію па ўстаноўленых заканадаўствам тарыфах).

Налічэнне платы па субсідаваных тарыфах будзе ажыццяўляцца ў дачыненні да жылых памяшканняў, у якіх грамадзяне зарэгістраваны па месцы жыхарства.

Яшчэ прадугледжваецца пераразлік платы за жыллёва-камунальныя паслугі ў выпадку няправільнага прымянення арганізацыяй тарыфу на жыллёва-камунальную паслугу з моманту выяўлення такога факта — але пераразлік можа быць не больш чым за тры месяцы, калі ён цягне даналічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі за папярэднія перыяды.

Парадак зняцця паказанняў прыбораў індывідуальнага ўліку расходу камунальных паслуг дапоўнены выпадкам падключэння да сістэмы дыстанцыйнага здымання паказанняў.

Для тых, хто пражывае па дагаворах найму жылога памяшкання ў інтэрнаце, прадугледжваецца парадак аплаты за тэхнічнае абслугоўванне ліфта, санітарнае ўтрыманне дапаможных памяшканняў, пакрыццё расходаў на электраэнергію, спажытую на асвятленне дапаможных памяшканняў і работу абсталявання, у тым ліку ліфтаў, зыходзячы з колькасці грамадзян, указаных у такіх дагаворах.

Будзь у курсе!

# «РЫБАЛКА ПА ПРАВІЛАХ»

## Прафілактычная акцыя пад такой назвай праходзіць на вадаёмах краіны

**Работнікамі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў сумесна з Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь будзе арганізаваны ўзмоцнены кантроль за выкананнем аматарамі падлёднай лоўлі Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства.**



Асаблівая ўвага пры правядзенні рэйдавых мерапрыемстваў будзе аддадзена выкананню рыбаловамі Правілаў пры ажыццяўленні лоўлі рыбы з выкарыстаннем прылад аматарскага рыбалоўства з агульнай колькасцю кручкоў ад 6 да 10 штук на рыбалова (зімовыя жарліцы, стаўкі і аналагічныя прылады рыбалоўства), а таксама падтрыманню рыбаловамі належнага санітарнага стану рыбалоўных угоддзяў, паведамілі ў Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў.

У адпаведнасці з Правіламі, весці лоўлю рыбы з выкарыстаннем прылад аматарскага рыбалоўства з агульнай колькасцю кручкоў ад 6 да 10 штук на чалавека дазваляецца членам Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Рыбаловы, якія парушылі патрабаванні Правілаў, нясуць адміністрацыйную, крымінальную або іншую адказнасць у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам.

Згодна з артыкулам 15.35 КаАП Рэспублікі Беларусь, здабыча рыбы або іншых водных жывёл без належнага на тое дазволу, альбо ў забароненыя час або тэрміны, альбо ў забароненых месцах, альбо забароненымі прыладамі, альбо забароненымі спосабамі, а таксама замах на такую здабычу цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй прылад здабычы рыбы.

Знаходжанне ў рыбалоўных угоддзях або на прылеглай да іх тэрыторыі на адлегласці да аднаго кіламетра ад берагавой лініі рыбалоўных угоддзяў з забароненымі прыладамі рыбалоўства або рыбай, лоўля якой у дадзеным раёне і ў дадзены час або тэрміны забаронены альбо вага якой перавышае ўстаноўленыя нормы, без дакументаў, якія пацвярджаюць законнасць валодання рыбай, цягне накладанне штрафу ў памеры ад 5 да 30 базавых велічынь. За іншыя парушэнні Правілаў прадугледжана накладанне штрафу да 20 базавых велічынь.

Адначасова парушальнікам прыйдзецца пакрыць і шкоду, прычыненую навакольнаму асяроддзю ў выніку незаконнага адабрання рыбы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Шок

# З нажом на настаўніцу і вучняў...

**Жудаснае здарэнне адбылося ўчора ранкам у стаўбцоўскай сярэдняй школе № 2: тут школьнік напаў з нажом на настаўніцу і іншых вучняў. Выкладчыца і адзінаццацікласнік загінулі, двое вучняў атрымалі раненні.**




Па афіцыйнай інфармацыі Следчага камітэта, у міліцыю паступіла паведамленне, што ў СШ № 2 адзін са старшакласнікаў (2003 года нараджэння) падчас рантам узніклага канфлікту параніў нажом настаўніцу і яшчэ аднаго вучня. Ад атрыманых раненняў яны памерлі. Акрамя таго, яшчэ два школьнікі шпіталізаваны. «Папярэдне ўстаноўлена, што вучань прыбыў у школу каля 7.40, паставіў свой партфель у класе. Пазней ён вярнуўся ў клас, нанёс настаўніцы нажавое раненне. Настаўніца памерла на месцы здарэння». Пасля вучань выйшаў з класа, зайшоў у суседні. Там ён нанёс смяротнае раненне навучэнцу 11 класа. У сецiве пішуць, што 17-гадовага школьніка падвёз бацька, і толькі ён ад'ехаў ад навучальнай установы, як яму патэлефанавалі і сказалі вяртацца... Сын памёр на руках у бацькі...

Усе дэталі будуць вядомыя па выніках следства. Прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія Барадун паведаміла, што два пацярпелыя хлопчыкі былі прааперыраваныя. Урачы зрабілі ўсё магчымае для стабілізацыі іх стану. Для кансультацыі выехалі спецыялісты з вобласці. Пазней у Стаўбцоўскай цэнтральнай раённай бальніцы пацвердзілі стабільна цяжкі стан пацярпелых школьнікаў.

УСК па Мінскай вобласці распачата крымінальная справа па факце забойства двух асоб. На месцы здарэння працуе следча-аператыўная група. Расследаванне ўзяў пад асабісты кантроль кіраўнік Следчага камітэта Іван Наскевіч.

Вядома, што адразу пасля нападзення 15-гадовы школьнік збег, выскачыўшы з акна другога паверха будынка. У шасці раёнах Мінскай вобласці быў абвешчаны спецыяльны план «Сірэна». Падлетка затрымалі супрацоўнікі крымінальнага вышуку пры падтрымцы АМАПа ў 10.10 у гарадскім — непадалёку ад школы, дзе ўсё і адбылося. У школе яго характаразуюць як вельмі ціхага і спакойнага...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота БелТА.**



Грошы

# Студзеньская інфляцыя — 0,9 %

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў студзені гэтага года ў параўнанні са снежнем 2018-га склаў 100,9 % , са студзенем — 105,8 %, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, схільныя да ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у студзені ў параўнанні са снежнем склаў 100,7 %. Як адзначаюць спецыялісты Нацстата, харчовыя тавары за месяц падаражэлі на 1,3 % і на 6,2 % у параўнанні са студзенем мінулага года. Цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 0,7 %. Індэкс спажывецкіх цэн на паслугі ў студзені склаў 100,3 % да снежня мінулага года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# Мокры снег, а месцамі яшчэ і туман

## Кантраснае надвор'е ў лютым — калі ўначы мінус 10, то ўдзень да 5 цяпла

**У пачатку тыдня атмасферныя франты прынясуць сырое з ападкамі і парывістым ветрам надвор'е. Раніцай і ўначы месцамі чакаецца суцэльная галалёдзіца, а ўдзень — да пяці цяпла, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



У сярэдзіне тыдня ўслед за франтальнымі часткамі на тэрыторыю краіны пачне паступаць паветраная маса скандынаўскага паходжання. Тэмпературны фон трохі панізіцца, і па начах будзе падмарожваць, а з ростам атмасфернага ціску ападкаў будзе няшмат. У сераду месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. У асобных раёнах чакаецца туман, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, удзень — ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла.

У чацвер у асобных раёнах па краіне пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. Амаль паўсюдна чакаецца туман, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 7 градусаў, па ўсходзе краіны пры праясненнях панізіцца да 8—10 марозу. Удзень будзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла. У пятніцу ў вобласці павышанага ціску істотных ападкаў не чакаецца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, па паўднёвым усходзе краіны пры праясненнях — да мінус 10 градусаў, удзень — ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла. Па паўднёва-заходнім рэгіёне ўдзень будзе 4—5 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Ну і ну!

# Закаханая пара абакрала... сваю кватэру

**Пры ўстанаўленні асоб, якія мелі дачыненне да кватэрнага крадзяжу з узломам дзвярэй на тэрыторыі Фрунзенскага раёна сталіцы, у поле зроку супрацоўнікаў міліцыі трапіў не хто іншы, як гаспадыня гэтага жылля і яе сужыцель.**

Праз пару дзён зламыснікі былі затрыманы. Імі аказаліся непрацуючы 35-гадовы мінчанін, раней неаднаразова судзімы за злачынствы маёмаснага характару, а таксама за злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркатычных сродкаў, і яго 38-гадовая сужыцелька, таксама раней судзімая за незаконны абарот наркотыкаў.

Аператыўнікамі было ўстаноўлена, што незадоўга да здарэння жанчына здала сваю двухпакаёвую кватэру двум маладым людзям. Напярэдадні дня нараджэння зламысніцы, скарыстаўшыся адсутнасцю наймальнікаў у кватэры, пара здзейсніла крадзеж: у гаспадыні меўся другі камплект ключоў. У мэтах адводу ад сябе падазрэнняў яны ўзламалі металічныя ўваходныя дзверы і выкралі бытавую і лічбавую тэхніку, грошы — 3850 долараў ЗША, 1200 расійскіх і 100 беларускіх рублёў, а таксама адзенне і абутак. Напрыканцы паласаваліся плаўленым сырам наймальнікаў жылля.

Акрамя гэтага, на здымнай кватэры аператыўнікамі было выяўлена і канфіскавана 0,2 грама асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва «Альфа-PVP».

На скрадзеныя грошы фігуранты знялі кватэру на вуліцы Гурскага ў Мінску, дзе і былі затрыманы супрацоўнікамі міліцыі. Вядома, што частку сумы мужчына выдаткаваў на дарагі падарунак сваёй каханай — залаты пярсцёнак з дыяментам.

Супрацоўнікі міліцыі ўстанаўліваюць абставіны набыцця псіхатропаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Дзяржбюджэт не павінен быць адзіным «донарам» для вышэйшай школы

## У Міністэрстве адукацыі агучылі асноўныя задачы галіны на найбліжэйшы год

**Якая форма атэстацыі найбольш эфектыўная ў школе? Чаму раней выпускнікі пісалі сачыненне, а сёння здаюць пераказ? Ці можа тэст даць аб'ектыўную ацэнку ведаў? Якім павінен быць экзамен: вусным, каб дзеці канчаткова не развучыліся фармуляваць свае думкі і разважаць, або пісьмовым, які ў большай ступені застрахаваны ад суб'ектывізму? Адназначных адказаў на гэтыя пытанні пакуль няма. Але на нядаўняй нарадзе ў кіраўніка дзяржавы міністр адукацыі заявіў пра магчымасць змянення формы выпускных іспытаў на выхадзе са школы. На калегіі свайго ведамства, дзе падводзіліся вынікі работы галіны за мінулы год і ўзгадняліся планы на бягучы, Ігар КАРПЕНКА крыху прыадкрыў заслону над будучым: «Існуючая форма выніковай атэстацыі таксама выклікае дадатковую нагрузку на школьнікаў, таму Міністэрствам адукацыі сумесна з настаўнікамі-практыкамі, метадыстамі, навукоўцамі прапрацоўваюцца магчымыя варыянты яе правядзення. Мы зможам разгрузіць выпускнікоў адзінаццатага класа, увязаўшы па форме і змесце выпускныя экзамены са здачай цэнтралізаванага тэсціравання», — паведаміў ён.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### Ці аб'ектыўная школьная адзнака?

Відавочна, што ранейшая рэйтынгавая сістэма падліку балаў на ЦТ для выпускной атэстацыі зусім не падыходзіла. Але сістэму падліку балаў на ЦТ спрабуюць змяніць так, каб новая методыка дазваляла супаставіць узровень ведаў абітурыента, прадэманстраваных на ЦТ, з яго школьнымі ведамі. Да таго ж новая методыка, як лічаць у міністэрстве, дазволіць зняць псіхалагічны барьер, які ўзнікаў у абітурыентаў пасля атрымання нізкіх балаў. Але што, калі школьная адзнакі зноў не будуць пацвярджацца? Усё ж такі ЦТ — незалежная і аб'ектыўная форма ацэнкі ведаў... Няўжо ўсе выдатнікі, каб пацвердзіць свой школьны ўзровень, будуць набіраць на ЦТ ад 90 да 100 балаў? Ці магчыма такое?

Летась Міністэрствам адукацыі ўпершыню былі праведзены рэспубліканскія кантрольныя работы па матэматыцы ў сёмым класе і па геаграфіі — у дзясятым. «Мы хацелі даведацца, наколькі аб'ектыўна ацэньваюць навучэнцаў у школе, — паведаміў на калегіі Ігар Карпенка. — Вынікі проста здзівілі: па матэматыцы 60 % навучэнцаў не пацвердзілі адзнакі, выстаўленыя школьнымі настаўнікамі. Колькасць навучэнцаў, якія атрымалі за рэспубліканскую кантрольную работу па матэматыцы адзнакі 9 і 10 балаў, аказалася меншая на 8 працэнтаў, 7—8 балаў — на 18 працэнтаў. Ёсць падстава задумацца, чаму ў школах завышаюцца адзнакі. У гэтым навучальным годзе рэспубліканскія кантрольныя работы пройдуць у 10 класах па гісторыі Беларусі, матэматыцы, рускай і беларускай мове ў шэрагу школ, а таксама ва ўсіх гімназіях і ліцэях».

Між іншым, на міністэрскай кантрольнай па геаграфіі не змаглі пацвердзіць свае школьныя адзнакі 87 (!) працэнтаў дзесяцікласнікаў.

### Чаму стамляюцца вучні...

У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі па ўсіх вучэбных прадметах ажыццяўляецца пераход на абноўленыя навучальныя праграмы. Ён завершыцца ў 2021—2022 навучальным годзе. Па новых праграмах ужо навучаюцца вучні з першага па восьмы класы. За тры апошнія гады былі абноўлены і выдадзены 144 навучальныя дапаможнікі. Да 1 верасня гэтага года абновяць яшчэ 73.

Міністэрства адукацыі зараз аналізуе ўкараненне новых праграм і падручнікаў у адукацыйны працэс, вывучае меркаванне педагогаў, вучняў і іх бацькоў.

«У цэлым праграмы і падручнікі пазітыўна ўспрымаюцца ў школах», — падкрэслівае міністр адукацыі і прыводзіць у якасці пацвярджэння сваіх слоў вынікі анлайн-анкетавання па пытаннях зместу абноўленых навучальных праграм для 7—8 класаў. У даследаванні прынялі ўдзел больш за 31 тысячу настаўнікаў-практыкаў. Амаль 88 % апытаных выказалі меркаванне, што далейшае спрашчэнне зместу праграм не патрабуецца.

Па выніках іншага даследавання, праведзенага Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, амаль 77 % навучэнцаў і 75 % бацькоў задаволены якасцю школьных падручнікаў. Пры гэтым выказваюцца некаторыя заўвагі, якія датычацца праблем з перагрузкай.

— Мы бачым, што праблема перагрузкі школьнікаў не столькі ў праграмах, колькі ў якасці падрыхтоўкі педагагічных кадраў, у арганізацыі працы настаўніка, у яго метадычнай адукаванасці. У тым, які аб'ём заданняў настаўнік задае на дом, як ён рыхтуецца да заняткаў, наколькі кваліфікавана выкарыстоўвае матэрыял падручнікаў і дапаможнікаў у рабоце з вучнямі. У гэтым кірунку павінна быць сканцэнтраваная наша работа, якая ўключае выданне для настаўнікаў-прадметнікаў адпаведных метадычных дапаможнікаў, арганізацыю павышэння кваліфікацыі па метадыцы выкладання, — кажа міністр. — Перагрузка вучняў можа быць выклікана і тым, што замест устаноўленай санітарнымі нормамі і вучэбнымі планамі максімальна дапушчальнай сярэдняй колькасці вучэбных і факультатыўных заняткаў (6—7 у дзень у 7—8 класе) па жаданні бацькоў уводзяцца дадатковыя платныя ўрокі (замест аднаго — некалькі профільных прадметаў або другая замежная мова), якія прыводзяць да разумовага і фізічнага знясілення.

Ігар Карпенка запэўнівае, што пазіцыя міністэрства па забеспячэнні даступнасці якаснай адукацыі для кожнага навучэнца будзе заставацца нязменнай. Справядлівай, на яго думку, стала адмена экзаменаў у пяты клас гімназій. Цяпер адораныя дзеці могуць навучацца ў любой установе адукацыі, паколькі і ў звычайных сярэдніх школах ёсць магчымасць вывучэння асобных прадметаў на павышаным узроўні ў 5—8 класах. «Адмену экзаменаў падтрымалі 88,8 % бацькоў і 90,7 % настаўнікаў, — паведаміў ён на калегіі. — А ў будучыні плануецца стварыць Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк, які дакажа, што ёсць і іншыя, больш эфектыўныя формы адбору таленавітых дзяцей, чым экзамены ў гімназіі...»

### Ці проста трапіць да дырэктара школы?

У бягучым навучальным годзе для вучняў 10—11 класаў школ быў уведзены прадмет «Працоўнае навучанне». Для арганізацыі адукацыйнага працэсу вызначаны пералік, які ўключае больш за 70 прафесій. Ён фарміраваўся з улікам рэальных магчымасцяў устаноў адукацыі, запытаў навучэнцаў, патрэб рынку працы і запатрабаванасці прафесій у рэгіёне.

З мэтай папулярызацыі сельскагаспадарчых прафесій з 1 верасня адкрыліся профільныя класы аграрнай накіраванасці. «Прашу ўзяць пад асаблівы кантроль забяспечанасць такіх класаў неабходным абсталяваннем і метадычнымі матэрыяламі, — звярнуўся да прадстаўнікоў рэгіянальных органаў кіравання адукацыяй Ігар Карпенка. — Міністэрствам адукацыі сумесна з Міністэрствам спорту і турызму прапрацавана таксама пытанне аб адкрыцці профільных класаў спартыўна-педагагічнай накіраванасці».

**«Па матэматыцы 60 % навучэнцаў не пацвердзілі адзнакі, выстаўленыя школьнымі настаўнікамі».**

Па словах кіраўніка галіны, аналіз зваротаў у Міністэрства адукацыі сведчыць аб недастаткова якаснай рабоце з грамадзянамі на месцах: кожны трэці зварот мог быць вырашаны на ўзроўні вобласці, раёна або нават школы...

— Напрыклад, дзіця — гіперактыўнае, а школа адразу накіроўвае яго на камісію па справах непаўнагалетніх, бо так прасцей, — прывёў ён канкрэтны прыклад. — А дзе сацыяльныя педагогі, дзе псіхолагі, нашы сацыяльна-педагагічныя цэнтры, надзеленыя для гэтага спецыяльнымі функцыямі? На працягу двух гадоў адным з самых праблемных застаецца таксама пытанне некарэктных паводзін членаў адміністрацыі і іншых педагагічных работнікаў устаноў адукацыі: кожны дзясяты зварот прысвечаны гэтай тэме. Скажу шчыра: трапіць на прыём да некаторых дырэктараў складаней, чым да міністра адукацыі. Думаю, што не трэба кіраўнікам устанаўліваць гадзіны для прыёму грамадзян па асабістых пытаннях. Знаходзячыся ў школе, вы павінны ў любы час прымаць грамадзян — гэта ваш абавязак!

### Канкурэнцыя за бюджэтныя сродкі

«Каб не страціць чалавека ў цені адзнак і экзаменаў, прапрацавана пытанне змянення механізму правядзення ўступнай кампаніі ў ВНУ. Для тых, хто паступае на асобныя спецыяльнасці, плануецца праводзіць дадатковыя ўнутраныя выпрабаванні, — праінфармаваў удзельнікаў калегіі Ігар Карпенка. — Такі падыход быў ухвалены і Рэспубліканскім саветам рэктараў ВНУ. Але для сёлетніх выпускнікоў нічога не зменіцца».

Міністр таксама паведаміў, што колькасць студэнтаў у краіне скарацілася. Сёння вышэйшую адукацыю атрымліваюць 283 тысячы студэнтаў (у 2011 годзе іх было больш за 400 тысяч). Ёсць меркаванне, што аптымальнай для нашай краіны з'яўляецца лічба ў 300 тысяч студэнтаў.

З улікам патрабаванняў работадаўцаў абнаўляюцца навучальныя планы і праграмы вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Сістэматычна пераглядаюцца наменклатура спецыяльнасцяў і адукацыйныя стандарты, па якіх вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў і рабочых, з абавязковым прыцягненнем да гэтага заказчыкаў кадраў.

У краіне функцыянуе больш за тысячу філіялаў кафедраў у арганізацыях і на прадпрыемствах. Усе тыпавыя навучальныя планы, распрацаваныя і зацверджаныя ў 2018 годзе, а таксама праекты тыпавых вучэбных планаў, якія яшчэ распрацоўваюцца, прадугледжваюць праходжанне практыкі пачынаючы з першага курса.

— Таму работадаўцам трэба спыніць размовы аб тым, што мы рыхтуем не тыя кадры для рэальнага сектара эканомікі, — падкрэсліў міністр. — Тым больш што ў краіне ствараецца Нацыянальная сістэма кваліфікацый, дзе заказчыкі кадраў будуць фарміраваць пералікі кампетэнцый і кваліфікацыйных характарыстык пад патрэбы эканомікі і суб'ектаў гаспадарання.

Для аптымізацыі II ступені вышэйшай адукацыі з гэтага года ўводзіцца адзіная праграма магістратуры — для кадравага забеспячэння навукова-інавацыйнай сферы і сістэмы адукацыі. Яе мадэрнізацыя будзе накіравана на павышэнне якасці, эфектыўнасці і экспартнага патэнцыялу. «У магістратуру на бюджэт павінны ісці толькі самыя здольныя, якія жадаюць займацца або навукай, або выкладаннем», — лічыць міністр адукацыі.

**Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар ПЕТРЫШЭНКА**, які прыняў удзел у выніковым пасяджэнні калегіі Міністэрства адукацыі, заўважыў, што з гэтага года прагназаваннем аб'ёмаў падрыхтоўкі кадраў займаецца Міністэрства працы і сацыяльнай абароны сумесна з Міністэрствам эканомікі. Адпаведна Міністэрства адукацыі на аснове іх даных сфарміруе аб'ектыўныя канкрэтныя лічбы прыёму, заснаваныя на патрэбах эканомікі, дэмаграфічным прагнозе і балансе працоўных рэсурсаў. **Ведамству трэба будзе па кожнай спецыяльнасці і па кожнай ВНУ прадставіць ураду аргументаванае абгрунтаванне кантрольных лічбаў прыёму. Па словах Ігара Петрышэнкі, на працягу гэтага года неабходна таксама падрыхтаваць пытанне аб пераходзе на конкурсную аснову іх фарміравання. Гаворка ідзе аб бюджэтнай форме навучання.**

«Права на прыём і падрыхтоўку спецыялістаў па асобных спецыяльнасцях павінны атрымліваць установы адукацыі, якія маюць для гэтага адпаведныя ўмовы: педагагічныя кадры, матэрыяльна-тэхнічную базу і базу для арганізацыі практыкі, — растлумачыў сваю думку віцэ-прэм'ер. — Тыя, хто не атрымае бюджэтных сродкаў на падрыхтоўку спецыялістаў, змогуць набіраць абітурыентаў платна».

**Амаль 88 % апытаных выказалі меркаванне, што далейшае спрашчэнне зместу праграм не патрабуецца.**

Задача павышэння канкурэнтаздольнасці і якасці — прыярытэтная ў рабоце профільнага міністэрства. Размеркавальны прынцып фінансавання сыходзіць у мінулае. Універсітэты павінны канкурыраваць паміж сабой за атрыманне бюджэтных сродкаў, падкрэсліў Ігар Петрышэнка. Дзяржаўны бюджэт не павінен быць адзіным «донарам» у сістэме вышэйшай адукацыі. Неабходна перайсці да шматканальнага фінансавання вышэйшай школы, прыцягваць інвестыцыі, сродкі інавацыйных фондаў, спонсараў, развіваць пазабюджэтную дзейнасць...

Ігар Петрышэнка таксама адзначыў, што на кантролі ўрада застаюцца пытанні арганізацыі харчавання ва ўстановах адукацыі. Ён канстатаваў, што эфектыўная сістэма кантролю ў гэтай сферы пакуль так і не створана. Віцэ-прэм'ер даручыў Міністэрству адукацыі сумесна з Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю ў першым паўгоддзі правесці маніторынг выканання даручэнняў урада па якасці школьнага харчавання і прадставіць свае прапановы, у тым ліку з ацэнкай работы кадраў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ГАЛЕРЭЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асаблівая роля ў захаванні гэтай памяці, ва ўсведамленні і ўвекавечванні драматычных і гераічных эпізодаў, бессмяротных подзвігаў і пакут нашага народа належыць мастацкай культуры. Ваенныя падзеі знайшлі сваё вобразнае ўвасабленне ў творах жывапісу, скульптуры, графікі і архітэктурных ансамблях. Гэтыя творы мастацтва злучылі ў сабе дакументальнасць і дакладнасць падзей з асабістымі перажываннямі, адчуваннямі і ўспамінамі, з пачуццямі і эмоцыямі. І калі па кнігах і дакументах Вялікую Айчынную вайну вывучаюць, то па творах мастацтва яе разумеюць і перажываюць, бо візуальнае ўяўленне пра гісторыю — адно з самых моцных і запамінальных.



**Яўген Яўстафіевіч Красоўскі (1908—1980). «Партрэт партызана Пятра Кашэ». 1943 г. Палатно на кардоне, алей.**

Бясцэнны ўнёсак у мастацкі летапіс Вялікай Айчыннай вайны зрабілі вядомыя майстры выяўленчага мастацтва. У рэестры класічных дасягненняў нашай спадчыны ў гэтай галіне варта назваць «Абаронцаў Брэсцкай крэпасці» Івана Ахрэмчыка, «Мінск. 3 ліпеня 1944 года» Валянціна Волкава, «Маё нараджэнне» Леаніда Шчамялёва, «Віцебскія вароты» Міхаіла Савіцкага, «Партызанскае вяселле» Мая Данцыга, «1941. Над Прыпяццю» Віктара Грамыкі. Гэтыя работы буйной формы, створаныя непасрэднымі ўдзельнікамі і сведкамі вайны, сталі ў гісторыі нашай культуры кульмінацыйным момантам, які маркіруе этап надзвычай магутнай рэфлексіі і найярчэйшага мастацкага ўвасаблення калізій вайны.

Аднак гучнае прызнанне маштабных праграмных твораў на ваенную тэму не павінна засланяць ад нас рэчы больш сціплыя, камерныя, якія часта нясуць у сабе неацэнную паэтычную праўду перажыванняў ваеннай рэчаіснасці. Такія чыстыя і праўдзівыя чалавечыя выказванні, замацаваныя ў жывапісе і графіцы менавіта ваенных гадоў, маюць асаблівую мастацка-дакументальную каштоўнасць, паказваюць эвалюцыю творчасці многіх беларускіх мастакоў, якія з першых дзён вайны сышлі на фронт і ў партызанскія атрады.

## Замалёўкі з пярэдняга краю

Звязаныя з вайной умовы жыцця адбіліся і на самім характары выяўленчага мастацтва, на відавых і жанравых прыярытэтах. Акцэнты пераносяцца на аператыўныя віды мастацтва, перш за ўсё на графіку малых формаў — гэткага выяўленчага рэпартажу з месца ваенных падзей. Гэта разнастайныя замалёўкі стану, дзеянняў, партрэты салдат і афіцэраў, адлюстраванне паходнага побыту, населеных пунктаў, названых у зводках. Людзі занятыя справай: яны дзейнічаюць або адпачываюць, засяроджаныя або вясёлыя, але нават у гэтых асаблівых абставінах яны такія, як заўсёды, яны жывуць...

Асаблівую ролю набывае «партрэтная франтавая замалёўка», калі вобразы ваенных ствараліся не пасля бітваў, а непасрэдна на перадавой паміж баямі: у партызанскіх пунктах, медсанбатах і г. д. Такія партрэты-эцюды, дзе чалавек прадстаўлены ў дзейснай узаемасувязі з навакольным светам, пакінулі нам беларускія мастакі Сяргей Раманаў, Генрых Бржазоўскі, Сцяпан Андруховіч, Міхаіл Бельскі, Ісак Давідовіч. Як правіла, гэта паясныя ці пагрудныя выявы з больш старанна выпісанымі галавой і рысамі твару, абагульнена, бегла намечанымі лініямі фігуры, але пры гэтым абавязкова дакладна прамаляванымі дэталямі адзення і галаўных убораў, па якіх лёгка вызначаліся род войскаў, знакі адрознення і ўзнагароды партрэтаванага. Побач з аўтарскім подпісам змяшчаўся і кароткі тлумачальны тэкст, дзе пазначаліся месца, назва ваеннай аперацыі, фронту, злучэння, часці, а таксама звесткі пра чалавека, з якога пісаўся партрэт.

Новая «дакументаліцская» якасць, яшчэ больш усвядомленае значэнне падзей, што адбываюцца проста тут і цяпер, шмат у чым вызначылі рысы, уласцівыя стылістыцы гэтых работ — непатрабавальных, лаканічных і праўдзівых. У іх няма нейкіх фармальных адкрыццяў, клопату пра форму і мову, пра пластычную завершанасць, яны пазбаўлены нярэдка не толькі вонкавага глянцу, але і цвёрда адпрацаванай сумы тэхнічных прыёмаў. Часам сучаснаму гледачу можа здацца, што мастак адкінуты абставінамі назад, да «азбукі», з якой пачынаў свой шлях у прафесіі. Але каштоўнасць гэтых работ заключаецца, перш за ўсё, у смелай сведкавай інтанацыі, жыццёвай дакладнасці. Мастак захоплены сапраўдным, і калі ў руках у яго ўсяго толькі невялікі кавалак паперы і аловак, ён сваім магічным талентам спадзяецца занатаваць, захаваць самае дарагое ў гэтым хісткім свеце — вобраз чалавека...



**Ісак Аронавіч Давідовіч (1911—1993). «Партрэт капітана Шылава». 1943 г. Папера, вугаль.**

## Ад радавых да «помніка эпохі»

Жывапісныя партрэты, выкананыя ў ваенны перыяд, можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Першую групу складаюць так званыя ваенныя партрэты, прычым важна адзначыць, што пераважаюць адлюстраванні не военачальнікаў, а партрэты радавых байцоў Чырвонай Арміі. Сапраўды ўсенародная вайна, масавыя подзвігі простых людзей, якія пайшлі на фронт і не трымалі да таго зброі ў руках, абумовілі павышаную цікавасць мастакоў да раскрыцця вобразаў сціплых, але сапраўдных герояў. Адсюль пільны інтарэс да псіхалагічнага складніка, да разнастайных праяў асобаснага пачатку мадэляў, якія знайшлі сваё пераканаўчае ўвасабленне ў партрэтах Яўгена Красоўскага, Яўгена Зайцава, Ісака Давідовіча і іншых.

Не апошняе месца ў мастацтве ваенных гадоў займае і аўтапартрэт. Гэты спецыфічны род мастацкага самааналізу стаў формай лірычнага адкрыцця майстроў, якія з хваляваннем разважаюць пра лёс краіны, мастацтва, пра сваё ўласнае прызначэнне ў цяжкую для айчыны хвіліну. Яскравым прыкладам з'яўляецца аўтапартрэт Барыса Няпомняшчага — франтавіка, які дайшоў да Берліна. У ім выяўлены і падкрэслены рысы, уласцівыя большасці яго таварышаў па службе, — бескампрамісная рашучасць і цвёрдасць духу.



**Міхаіл Лявонцьевіч Бельскі (1921—1988). «Старшы сяржант Міхайлаў». 1944 г. Папера, аловак.**

Па меры набліжэння перамогі з'яўляюцца партрэты вайскоўцаў ва ўрачыста-прыўзнятым, гераізаваным выглядзе. Перад савецкім мастацтвам была пастаўлена задача стварэння «помніка эпохі», праслаўлення правадыроў і герояў вайны. Узнікае «серыйны» ўзор парараднага партрэта героя-ваеннага з усімі звыклымі для яго рысамі: з эпалетамі і ордэнамі, пратакольна-дакладным малюнкам знешняга выгляду мадэлі, стэрэатыпнасцю пластычнай манеры.

Іншая разнавіднасць жывапіснага партрэта ваеннага часу паказана ў работах, дзе адлюстраваны людзі мастацтва. З'яўленне такіх твораў было выклікана тым, што ў трагічныя дні вайны многія прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі таксама ваявалі, змагаліся з ворагам сваёй зброяй — зброяй мастацтва. У канцэртных франтавых брыгадах удзельнічалі Аляксандра Нікалаева, Глеб Глебаў, Ларыса Александроўская, Ісідар Балоцін і іншыя. Разглядаючы партрэтныя вывы людзей культуры, нельга не заўважыць, што ў цэнтр мастакоўскага выказвання становіцца чалавечы характар вялікага маштабу, мужная сіла напалову з болем велізарных страт.

Іван Ахрэмчык рашуча вызваляе сваіх герояў — Аляксандру Нікалаеву і Глеба Глебава — ад найменшага элемента парараднасці, тэатральнасці. Мастак з няўмольнай аб'ектыўнасцю адлюстроўвае на тварах усе нанесеныя ваеннай траўмы, духоўна-маральны стрыжань і непахіснасць волі герояў. Перад намі надзіва дакладныя вобразы людзей, якія ў поўнай меры прынялі на сябе працу вайны.



**Генрых Францавіч Бржазоўскі (1912—2006). «Партызаны». 1944 г. Папера, каляровы аловак.**

## Подых часу

Неад'емнай часткай адзінай карціны, якая складваецца ў нашым уяўленні пры спробе абагульніць уражанні ад асобных дэталяў і эпізодаў у мастацтве ваенных гадоў, з'яўляецца і тэма горада. Тыя нешматлікія работы, што дайшлі да нас і перадаюць атмасферу Мінска ваеннага часу, — мастацкія дакументы велізарнай сілы. Ключавое значэнне для гісторыі гарадскога пейзажа гэтага перыяду маюць работы Анатоля Тычыны, якога паўнапраўна можна назваць галоўным «партрэтыстам» Мінска.



**Яўген Аляксеевіч Зайцаў (1908—1992). «Партрэт народнай артысткі А. В. Нікалаевай». 1943 г. Палатно, алей.**

Мастак адным з першых бярэцца за аловак і адлюстроўвае акупаваны горад з яго пустэльнымі вуліцамі і нейкай неўласцівай ранейшым гарадам здранцвеласцю. Адчуванне прывіднага горада, які балансуе паміж быццём і небыццём, рэальным і фантастычным, увасоблена ў «Руінах Мінска» (1944) і «Разбураным Мінску» (1944). Жыццё амаль зусім замерла, усё прасякнута пачуццём трывогі, атмасферай небяспекі, што навісла над горадам і краінай. Па графічнай серыі Анатоля Тычыны можна меркаваць аб жыцці сталіцы і ў самыя цяжкія дні яе абароны, і тады, калі самае страшнае было ўжо ў мінулым.

Чаму сёння нас так цікавяць першакрыніцы — франтавыя замалёўкі, дзённікі, успаміны сведак, партрэты, створаныя ў самы разгар ваенных дзеянняў? У чым прычына невыказнага абаяння малюнкаў, зробленых на выцвілай паперы, на адвароце нейкіх старых чарцяжоў, бланкаў ваенных канцылярый?



**Генрых Францавіч Бржазоўскі (1912—2006). «Разведчык. Партызан атрада Градава». 1944 г. Папера, каляровы аловак.**

Напэўна, у тонкай узаемасувязі дакументальнага і мастацкага, у тым, што мастак і салдат выступаюць у адной асобе, якая парадніласа са сваім таварышам адным лёсам. Адсюль і шчырая інтанацыя, непадробныя пачуцці, і праўдзівасць, і жыццёвасць захаваных рэалій. Для нас сёння беглы накід з франтавога нататніка, выразная альбомная замалёўка, акварэль або маляўнічы эцюд ваеннай пары з'яўляюцца і крыніцамі самай дакладнай інфармацыі, і матэрыялам для рэканструкцыі жывой карціны эпохі.

**Кацярына ІЗАФАТАВА,**
**загадчык аддзела сучаснага беларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 15 марта 2019 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование лотов | Адрес лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадью 13,5 кв. м**, в капитальном строении – здании районного узла связи и автоматической телефонной станции с инв. № 320/С–19733, помещение на 3-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,25. Коэффициент местоположения – 1,0 | г. Жлобин, ул. Первомайская, 76 | **54,37** | 5,44 |
| 2 | **Помещение площадью 13,2 кв. м**, в капитальном строении – кирпичном здании участка обработки почтовых переводов с инв. № 320/С–19744, помещение на 2-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка - 0,25. Коэффициент местоположения – 1,0 | г. Жлобин, ул. Урицкого, 41 | **53,16** | 5,32 |
| 3 | **Помещение площадью 30,2 кв. м**, в капитальном строении – кирпичном здании отделения связи с сараем с инв. № 320/С–19750, помещение на 1-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,25. Коэффициент местоположения – 0,6 | г. Жлобин, ул. Шоссейная, 135 | **121,63** | 12,16 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232)7 9-67-44 |
| **Срок подачи заявления** | **С 12.02.2019 г. по 13.03.2019 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». **Подача документов по почте не допускается.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, BIC AKBBBY21302, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Условия пользования** | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) |
| **Размер штрафа** | Лот № 1, 2 – 0,5 базовых величин, лоты № 3–2 б. в., согласно Указа Президента РБ от 10.01.2013 г. №14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующего законодательства) |

**Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и представить необходимые документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом, нерезидентом Республики Беларусь, – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии Положения «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ»

**Предмет торгов – Лот № 1:**

1. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-29739 (наименование – административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное), площадью 1364,8 кв. м;
2. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-29741 (наименование – здание РБУ; назначение – здание специализированное иного назначения), площадью 434,0 кв. м;
3. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-29744 (наименование – столярный цех; назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), площадью 635,1 кв. м;
4. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-29749 (наименование – склад столярных изделий; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 421,0 кв. м;
5. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-29752 (наименование – склад цемента; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)

**Имущественные права на земельный участок – Право постоянного пользования**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена без НДС, руб.** | **1 335 300,00** | **Размер задатка, руб.** | **9 360,00** |
| **Условия продажи** | Наличие договоров аренды | | |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |

*Участник аукциона, выигравший торги (лицо, приравненное к победителю аукциона), оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, затраты Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затраты по уплате вознаграждения Организатору аукциона

**Аукцион состоится <u>12 марта 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325</u>**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, а также иную информацию об объектах торгов, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**<u>Последний день приема заявлений</u> – 11 марта 2019 г. до 17.00**

**Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Белремстройсвязь» опубликовано в газете «Звязда» от 29.11.2018 г.**

## Извещение о проведении третьего повторного аукциона по продаже объектов недвижимости Коммунального унитарного предприятия по сдаче в аренду имущества «Сморгонская Надежда»

| | |
|---|---|
| Предмет аукциона и его местонахождение | **Лот № 1** – комплекс зданий и сооружений, расположенные по адресу: пр-т Индустриальный,15, 15/1, 15/2, 15/3, 15/4, 15/7, 15/8, 15/9, 15/10, 15/11, 15/12, 15/13 в г. Сморгони Гродненской области |
| Начальная цена предмета аукциона | 1401360 руб. 60 коп. (в том числе НДС 20 % 233560 руб. 10 коп. ) |
| Продавец недвижимого имущества | Коммунальное унитарное предприятие по сдаче в аренду имущества «Сморгонская Надежда».<br>Адрес: 231044, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 15, оф. 301 (УНП 500213060), тел.: +375 (29) 866-10-00 (МТС), +375 (1592) 469-42 |
| Характеристика объектов | **Капитальные строения с инв. №№:**<br>**443/С-18681 – здание главного производственного корпуса** – 1990 г. п., одноэтажное панельно-кирпичное (КТП-1, КТП-2, КТП-3), S общ. – 20211,9 кв. м; **очистные сооружения; БСЦ; галерея; КПП; ворота; забор**. Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ИЧУПП «Электроинжиниринг» Мазурина В. И. – 65,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 28.03.2019 г.<br>ООО «Завод трансформаторных подстанций» – 1668, 0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>ИП Насекайло З.Ф. – 144, 0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 16.07.2020 г.<br>ООО «Вендмирус» – 64,7 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 30.04.2019 г.<br>ООО «ВудЛесКонтракт» – 756,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>**443/С-18682 – здание склада готовой продукции** – 1990 г. п., одноэтажное асбестоцементное, S общ. – 11860,0 кв. м; **склад закрытый; склад открытый;** Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ООО «Бальга» – 100,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.12.2018 г.<br>**443/С-18683 – здание административно-бытового корпуса** – 1990 г. п., трехэтажное кирпично – панельное, S общ. – 2849,0 кв. м; **с подвалом**. Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ООО «Норд Транс Логистик» – 12,5 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>ООО «Завод трансформаторных подстанций» – 66,9, 0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>ООО «Нанотехновак» – 108, 0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 07.10.2019 г.<br>ООО «Вендмирус» – 17,6 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 30.04.2019 г.<br>ООО «Групп Эверс» – 17,8 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 04.12.2019 г.<br>ООО «ВудЛесКонтракт» – 756,0 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 31.07.2019 г.<br>**443/С-18684 – здание складского блока с зарядной** – 1990 г. п., одноэтажное кирпично-шиферное, S общ. – 1198,8 кв. м. Сдаются в аренду нежилые помещения:<br>ЧПУП «МеханикЭнерго» – 329,7 кв. м. Дата окончания действия договора аренды – 28.02.2019 г.<br>**443/С-18685 – бытовое здание склада готовой продукции** – 1994 г. п., одноэтажное панельное, S общ. – 57,0 кв. м;<br>**443/С-18671 – градирня** – 1990 г. п., одноэтажное шиферное, S общ. – 40,0 кв. м;<br>**443/С-21676 – здание склада цемента** – 1990 г. п., одноэтажный кирпичный, S общ. – 343,5 кв. м; **подвал ж/б**; **рампа**; **опорные конструкции под силоса**; **силоса**;<br>**443/С-21677 – склад заполнителей** – 1990 г. п.; в составе **транспортировочная, галерея, галерея, прием песка, приемочный бункер, транспортировочная, прием керамзита и щебня, приемочный бункер, транспортировочная, склад заполнителей, техническое здание, натяжная станция, передаточная, приемный отдел керамзита и щебня, техническое здание;**<br>**443/С-21661 – здание склада ГСМ и эмульсола** – 1990 г. п., одноэтажное кирпичное, S общ. – 62,1 кв. м;<br>**443/С-21662 – компрессорная** – 1990 г. п., двухэтажная железобетонная, S общ. – 602,3 кв. м; **подвал бетонный**;<br>**443/С-21663 – отделение приготовления химдобавок** – 1990 г. п., одноэтажное кирпичное, S общ. – 167,7 кв. м; **подвал ж/б**;<br>**443/С-21664 – здание КПП** – 1990 г. п., одноэтажное кирпичное, S общ. – 9,6 кв. м;<br>**443/С-21665 – внутриплощадочные и внеплощадочные электросети:** протяженность линейного сооружения – 389,3 м;<br>**443/С-21666 – автодороги,** протяженность – 1920,4 м; бетон, асфальтобетон;<br>**443/С-21667 – сети связи и сигнализации,** протяженность линейного сооружения – 14,0 м;<br>**443/С-21668 – сети водопровода**, протяженность линейного сооружения – 66,5 м;<br>**Сооружение – внеплощадочные ж/д пути**, протяженность 694,00 м, расположенные по адресу: г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, внеплощадочные и внутриплощадочные ж/д пути (инв. № 0328 по бух. учету);<br>**Сооружение – внеплощадочные ж/д пути**, протяженность 826,80 м расположенные по адресу: г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, внеплощадочные и внутриплощадочные ж/д пути (инв. № 0329 по бух. учету) |
| Информация о земельном участке | Площадь земельного участка с кадастровым номером 425650100001004336 – 9,4471 га. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности |
| Условия использования земельных участков | |
| Ограничения по использованию земельного участка | Право постоянного пользования |
| Условия проведения аукциона | *Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона. Условия оплаты по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее **20** рабочих дней с момента подписания протокола аукциона* |
| Публикации извещений о проведении торгов по продаже имущества КУП «Сморгонская Надежда» | *Газета «Звязда» от 11.12.2018, от 30.01.2019, от 11.02.2019* |

1. **Аукцион состоится 22 февраля 2019 года в 12.00 по адресу: 231044, Гродненская обл., г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 15, оф. 301**. Заявки принимаются с 9.30 до 17.00 по электронной почте: nisabel@mail.ru, а также по адресу: г.Гродно, 230023, а/я 174. Последний день подачи заявлений – **21 февраля 2019 года до 24.00**.

2. **Организатор аукциона** – ***Индивидуальный предприниматель Бойкова Наталья Николаевна, почтовый адрес 230023, г. Гродно, а/я 174, тел.: +375(29) 866-10-00 (МТС), +375 (152) 68-57-55 (оф.), (время работы с 9.30 до 16.00, кроме выходных и праздничных дней), e-mail: nisabel@mail.ru.***

3. **Порядок ознакомления с имуществом, являющимся предметом торгов** – до окончания срока приема заявок на участие в торгах можно ознакомиться с информацией об имуществе, составляющем предмет продажи (пн.–пт. с 9.30 до 17.00) по адресу: 231044, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 15 (тел. +375 (29) 633-74-08).

4. **Место нахождение предмета аукциона** – Гродненская область, г. Сморгонь, проспект Индустриальный, д. 15. Земельный участок с кадастровым номером 425650100001004336, площадь – 9,4471 га, назначение – земельный участок для обслуживания зданий ликвидированного завода КПД.

5. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 16 от 8 января 2013 г. Аукцион является открытым.

5.1. Порядок проведения торгов: шаг аукциона составляет 5 % от начальной цены предмера аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает в себя НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) не позднее 30 дней со дня проведения аукциона. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов.

6. **Размер задатка для участия в аукционе – 200 000 руб. 00 коп.** Задаток перечисляется на р/с BY38BPSB 3012 1265 5201 2933 0000 в ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код банка BPSBBY2X, получатель – КУП «Сморгонская Надежда», УНП 500213060.

7. К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и предоставившие организатору аукциона заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на *текущий (расчетный) счет продавца №* BY38BPSB 3012 1265 5201 2933 0000 в ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код банка BPSBBY2X, получатель – КУП «Сморгонская Надежда»», УНП 500213060;

копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством) – **для юридических лиц – резидентов Республики Беларусь;**

копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона – **для индивидуальных предпринимателей – резидентов Республики Беларусь;**

нотариально удостоверенная доверенность – **для представителя гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя;**

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – **для юридического лица, иной организации – нерезидента Республики Беларусь;**

легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – **для индивидуальных предпринимателей – нерезидентов Республики Беларусь;**

легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – **для представителя иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя.**

При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

5. Организатор торгов после опубликования извещения вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения

Ідэі маладых

# СТАРТАП-РУХ РОБІЦЬ СТАЎКУ НА ТЭХНАЛОГІІ

За права ўдзельнічаць у рэспубліканскім конкурсе «Сто ідэй для Беларусі» спаборнічалі маладыя вынаходнікі Гродзенскай вобласці

**У абласным туры было прадстаўлена больш за 30 наватарскіх распрацовак. На прэзентацыі можна было ўбачыць прамысловыя, аграрныя, экалагічныя, сацыяльныя праекты. Значную частку склалі распрацоўкі з выкарыстаннем ІТ-тэхналогій.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Напрыклад, у ліцэі № 1 Гродна распрацавалі мабільную праграму для вандроўнікаў. Яна дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй горада ў пэўным ракурсе — турыстычным, культурным ці духоўным. Галоўнае — тут ёсць карты. Праграма мае англамоўны варыянт. А ў будучыні яна будзе на польскай і літоўскай мовах. Яе можна спампаваць па QR- кодзе і усталяваць на мабільны тэлефон. Ліцэісты маюць намер распрацаваць такую праграму для іншых рэгіёнаў Беларусі.

Сапраўдную мару для дачнікаў прапануюць вучні з СШ № 12 Гродна. Гэта цяпліца на дыстанцыйным кіраванні. Для адпаведнага мікраклімату яе трэба абсталяваць электронпай начынкай. Аўтаномнасць забяспечаць сонечныя батарэі. Юныя распрацоўшчыкі напачатку вывучылі асаблівасці росту агароднінных культур, іх светлавы, цеплавы і харчовы рэжымы. У прамысловых маштабах існуюць такія аналагі, а школьнікі прапануюць дачны варыянт цяпліцы, якая будзе кіравацца праз інтэрнэт. Магчыма, гэта цяпліцы будучыні...

Больш прыземлены праект, але даволі цікавы, прэзентавала маладая маці ў дэкрэце Кацярына Юрэвіч. Яна прапануе альтэрнатыву дзіцячым артапедычным дыванкам і магнітна-масажным вусцілкам для ступняў. Кацярына прапануе прыстасаваць да шкарпэтак бусінкі для масажу. Можна да артапедычнай вусцілкі дадаць некалькі масажных элементаў для паляпшэння кровазвароту. Гэта могуць быць дробныя элементы з розных прыродных матэрыялаў — дрэва ці гліны.

Тэму вусцілак, але з тэхнічным ухілам, прадставіла і Паліна Жак са Слоніма. Яна прапануе выкарыстоўваць для сушкі абутку вугляродную стужку, якая прашываецца ўнутры вусцілкі. У параўнанні з прамысловым аналагам, кажа Паліна, менш выгарае кіслароду, да таго ж напружанасць у электрасетцы не 220 вольтаў, а ўсяго 12.

Дзяўчына таксама прапануе выкарыстоўваць вугляродную стужку для падагрэву аўтамабільных крэслаў. Такая ідэя ўзнікла ў выніку назірання за татам і яго старым аўтамабілем, расказвае Паліна. Каб ён не мёрз, пакуль рухавік машыны не працуе, дачка і прыдумала яму такую грэлку-накідку. Гэты праект, дарэчы, абраны на рэспубліканскі конкурс.

У ліку пераможцаў абласнога тура і старшакласнік Іван Сільвановіч са Скідзеля. Яго вынаходства звязана з шырокім выкарыстаннем п'езаэлемента. Напрыклад, можна замяніць на яго батарэйкі ў аўтамабілях, якія выкарыстоўваюцца пры разблакіроўцы сігналізацыі. Альбо дадаць у красоўкі, якія будуць зіхацець. Але ўсё гэта дробязі, кажа Іван. П'езаэлектрычнасць можна выкарыстоўваць больш маштабна. Напрыклад, прымацаваць п'езаплёнку да дарожнага палатна, каб аўтамабілі падчас руху па дарозе выпрацоўвалі электраэнергію для асвятлення яе ліхтарамі. Па словах хлопца, гэтая ідэя прыйшла ў працэсе роздуму, як атрымаць электраэнергію без шкоды для навакольнага асяроддзя.

— Зараз галоўны трэнд — гэта тэхналагічныя праекты, — заўважае **член экспертнай камісіі Алег КАРШУК.** — Новая генерацыя моладзі сваімі тэхнічнымі прапановамі можа вырашыць пэўную задачу народнай гаспадаркі. За гэтым будучыня, і прырост такіх праектаў сёлета заўважны. Пераважаюць праекты, якія створаны на стыку навук. Напрыклад, «разумнае» земляробства і ІТ-тэхналогіі, іх аб'яднанне дае прарыўны варыянт. Гэта галоўны кірунак, на які вядуць паляванне інвестары.

Аб будучым стартапе марыць студэнтка ГрДУ Дар'я Раманоўская. Яна займаецца распрацоўкай тэхналогіі вырабаў з палімераў высокага ціску на прыкладзе смеццесартавальнага завода пад Гроднам. У перапрацоўку такія адходы амаль не ідуць (малочныя пакеты, пакеты для смецця і інш.). Даша лічыць, што з непрыдатнага пластыку можна рабіць паілкі і кармушкі для жывёл на фермах ці нават агароджу. Студэнтка расказала, што тэхналогія распрацавана, не хапае толькі абсталявання. Калі знойдзецца партнёр, яна зможа зарэгістравацца ў якасці рэзідэнта тэхнапарка і працягваць свой праект, які, дарэчы, таксама ўвайшоў у пяцёрку найлепшых.

— Ідэя конкурсу не толькі ў тым, каб выбраць канкрэтны праект, але і ў тым, каб вырасціць ініцыятыўных дзяцей, даць ім магчымасць маштабавання маленькага праекта, — разважае Алег Каршук. — Для гэтага вялікіх грошай не трэба. Напрыклад, у краінах-суседках гэта вядзецца ў рамках адукацыйных структур. А калі з'яўляецца прадукт, які можна прадаць, яго прадстаўляюць адразу ў некалькіх краінах, і гэта дае значны эканамічны эфект і выклікае зацікаўленасць у дзяцей. Гэта тая тэхналагічная будучыня, якая дасць развіццё наступным пакаленням. А таксама новыя ідэі для самарэалізацыі, да чаго зараз многія імкнуцца.

На рэспубліканскі конкурс таксама выбраны праект школьнікаў Зэльвенскай гімназіі. Яны прадставілі курс па фінансавай адукаванасці праз дыстанцыйнае навучанне. Зацікавіла камісію і медыцынская распрацоўка маладога ўрача Іаанны Івашкі аб спосабе ўзнаўлення цэласнасці барабаннай перапонкі пасля траўмы. Для гэтага яна прапануе выкарыстаць аўтафібрынную плёнку, атрыманую з крыві самога пацыента. Вызначыла камісія і сацыяльны праект маладых педагогаў СШ № 35 Гродна. Пры падтрымцы валанцёраў яны ствараюць тактыльныя кнігі для дзяцей з аслабленым зрокам.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Не прапусці!

# «Лічба»: проста, наглядна, даступна

**Першы фестываль лічбавых тэхналогій DigiFEST пройдзе ў ГрДУ імя Янкі Купалы.**

Галоўная мэта мерапрыемства — стымуляваць цікавасць дзяцей да лічбавых тэхналогій і робататэхнікі. Праграма фестывалю прадумана з улікам узросту ўдзельнікаў. Так, студэнтам, навучэнцам каледжаў і старшакласнікам будуць прапанаваны майстар-класы па праграмаванні мікракантролераў, робататэхніцы, 3D-мадэляванні і друку, праектаванні праграм і рабоце з платформай «Інтэрнэт рэчаў». Кагосьці зацікавяць майстар-класы па праграмаванні і кіраванні беспілотнымі транспартнымі сродкамі, канструяванні робатаў, праграмаванні шматфункцыянальных робатаў-маніпулятараў, выкананні розных чарцяжоў, схем і малюнкаў.

Для навучэнцаў малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту арганізуюць майстар-класы па праграмаванні і канструяванні мадэляў з выкарыстаннем механічных перадач і робата на дыстанцыйным кіраванні. Дзецям раскажуць, як стварыць праект «разумнага дома» з дапамогай лічбавай лабараторыі, пакажуць, як збіраць электрычныя схемы і прылады з дапамогай электроннага канструктара. Акрамя гэтага, усе ахвотныя змогуць прыняць удзел у майстар-класе па маляванні 3D-ручкай.

Падчас фестывалю пройдуць дэманстрацыі цікавых распрацовак у галіне робататэхнікі, удзельнікаў пракансультуюць па пытаннях атрымання адукацыі ў галіне лічбавых тэхналогій. Таксама адбудзецца прэзентацыя новай спецыяльнасці «Камп'ютарная фізіка», на якую ўпершыню будзе абвешчаны набор у ГрДУ імя Янкі Купалы ў 2019 годзе. Акрамя гэтага, партнёры ўніверсітэта правядуць прафарыентацыйны майстар-клас «Паспрабуй сябе ў ІТ-прафесіях».

Фестываль адбудзецца 16 лютага. Удзел ва ўсіх мерапрыемствах бясплатны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Прававая гасцёўня

# ЛЬГОТНУЮ КВАТЭРУ МОЖНА ПРАДАЦЬ ТОЛЬКІ Ў ВЫКЛЮЧНЫХ ВЫПАДКАХ

**На пытанні нашых чытачоў адказвае адвакат спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі № 3 па прававым забеспячэнні здзелак з нерухомасцю Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Сняжана БАХОРЫНА.**

*Дапамажыце разабрацца ў наступным пытанні: пасля разводу па рашэнні суда мне дасталася доля ў двухпакаёвай кватэры. Другая доля перайшла былой жонцы з непаўналетнім дзіцем. Кватэра льготная. Па рашэнні суда льготны крэдыт быў таксама падзелены адпаведна долям. На цяперашні момант мы прыйшлі да ўзаемнай згоды: прадаць кватэру цалкам. Падкажыце, з чаго пачаць і як дзейнічаць у далейшым?* (Віктар Львовіч Талай, Маладзечна.)

— Згодна з заканадаўствам жыллё, набытае з дапамогай ільготнага крэдыту, у перыяд пагашэння гэтага крэдыту продажу не падлягае. У выпадку датэрміновага ільготнага пагашэння крэдыту прадаць кватэру можна толькі ў выключных выпадках, з дазволу мясцовага выканкама. Да такіх выпадкаў адносяць пераезд у іншую мясцовасць, скасаванне шлюбу і некаторыя іншыя. Таму вам спачатку трэба знайсці сродкі і пагасіць крэдыт, а затым звярнуцца з заявай у мясцовы распарадчы і выканаўчы орган па атрыманне дазволу на продаж кватэры.

* * *

*Ці можна долю кватэры здаць у заклад або прадаць без згоды другога ўласніка? 1/2 кватэры ў маёй уласнасці, 1/2 — уласнасць брата. Асабовы рахунак адзін. Брат будуе жыллё і хоча прадаць або закласці банку сваю долю, каб не браць крэдыт. Ці можа ён гэта зрабіць без маёй згоды? Што наогул можна зрабіць з 1/2 кватэры, калі прапісаныя мы двое і ўласнасць на дваіх?* (Таццяна Сянько, Наваполацк.)

— Згодна з патрабаваннямі Грамадзянскага кодэкса саўладальнік можа і закласці, і прадаць сваю долю. Але ёсць асаблівы парадак продажу такой долі. Тут брат павінен выканаць ваша пераважнае права куплі, г. зн. спачатку прапанаваць купіць яе вам. У выпадку, калі вы адмовіцеся альбо на працягу месяца не адкажаце на яго прапанову, тады ён можа прадаць яе нейкай трэцяй асобе.

Што датычыцца закладу, то ён можа закласці сваю долю без вашай згоды, але калі банк у далейшым будзе рэалізоўваць закладзеную маёмасць (пры незахаванні патрабаванняў крэдытнага дагавора), ён, зноў жа, павінен прапанаваць спачатку вам выкупіць гэтую долю.

І яшчэ адзін момант: ваш брат не можа прадаць сваю долю кватэры па больш нізкай цане, чым прапанаваў спачатку вам.

А з нагоды вашага пытання аб тым, што наогул ваш брат можа зрабіць са сваёй паловай кватэры, то ён можа яе, апроч тых момантаў, якія мы толькі што разгледзелі, яшчэ падарыць або зрабіць завяшчанне.

* * *

*Атрымала ў спадчыну дом у вёсцы. У тэхпашпарце, зробленым у 1989 годзе, значыцца дзевяць гаспадарчых пабудоў. Да нашых дзён «дажылі» толькі тры — усе астатнія, драўляныя, разбурыліся і былі разабраны на дровы. Ці не паўстане пытанняў пры афармленні спадчыны і вырабе новага тэхпашпарта? Што рабіць, каб пазбегнуць штрафу і іншых санкцый?* (Жанна Леанідава, Мінск.)

— Для пачатку вам трэба звярнуцца да натарыуса для атрымання пасведчання аб праве на спадчыну на гэты дом. Натарыус будзе дакументы зыходзячы з таго, што напісана ў тэхпашпарце. Гэта значыць, вы фактычна атрымліваеце ў спадчыну дом і дзевяць гаспадарчых пабудоў. Затым, калі вы атрымаеце права ўласнасці, вам неабходна будзе звярнуцца ў мясцовы філіял або бюро дзяржаўнага агенцтва па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры. Вы запрашаеце прадстаўнікоў гэтага філіяла або бюро для складання ведамасці тэхнічных характарыстык, дзе будуць зафіксаваныя змены ў колькасці гаспадарчых пабудоў. І калі пры гэтым не парушаны якія-небудзь нормы тэхнічнай дакументацыі, то гэтыя змены зарэгіструюць і выдадуць вам новы тэхпашпарт. Думаем, ніякіх санкцый альбо штрафу ў вашым выпадку не павінна быць.

**Святлана БУСЬКО.**

# Мільён уражанняў і чытанка на памяць

**XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш (ММКВК), якая праходзіла пад дэвізам «Больш, чым кнігі», атрымалася не толькі заўважнай, але і надзвычай разнастайнай і шматбаковай падзеяй. Пяць дзён у рэжыме нон-стоп у межах форуму і літаратурнага сімпозіума «Пісьменнік і час» адбываліся прэзентацыі, сустрэчы і аўтограф-сесіі папулярных аўтараў, літаратурныя дыскусіі, круглыя сталы пісьменнікаў і выдаўцоў, творчыя майстар-класы і ўрокі замежнай мовы, флэшмобы, кінапаказы і тэатралізаваныя прадстаўленні, на якіх агулам пабывала больш як 61 тысяча гасцей.**



Кожны мог выбраць тое, што яму больш даспадобы: ці праехацца ад Палаца спорту да выставачнага павільёна «БелЭкспа» на паэтычным аўтобусе пад вершы і бардаўскія песні як маладых, так і ўжо вядомых беларускіх аўтараў з Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, ці сустрэцца і пагаварыць з любімым пісьменнікам непасрэдна на выстаўцы — так, сустрэча з лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры Святланай Алексіевіч выклікала сапраўдны аншлаг; ці ўзяць удзел у літаратурным квэсце або віктарыне па тым ці іншым творы; ці завітаць на шматлікія прэзентацыі кніжных навінак і, магчыма, адкрыць для сябе імёны новых цікавых літаратараў, ці, нарэшце, набыць — што немалаважна, па выдавецкім кошце, а ў апошні дзень работы выстаўкі і са зніжкамі — некалькі выданняў у дамашнюю бібліятэку.

Прычыніцца да Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу сёлета было можна, нават не наведваючы выдавецкія экспазіцыі. Амаль паўтара дзясятка сталічных кавярняў, пабаў і рэстаранаў далучыліся да тэматычнага кніжнага гастрафэсту «Смак чытання», які быў зладжаны ўпершыню, і ўключылі ў меню стравы, згатаваныя сучаснымі кухарамі паводле літаратурных бестселераў розных краін. Асаблівай папулярнасцю ў наведвальнікаў карысталіся калдуны з мясам і грыбамі паводле Уладзіміра Караткевіча («Дзікае паляванне караля Стаха»), верашчака з блінамі, на якую кулінараў натхніла «Новая зямля» Якуба Коласа, апісаныя ў «Знесеных ветрам» Маргарэт Мітчэл грачаныя аладкі з кляновым сіропам, пірог «пахобіцку» паводле Джона Рональда Руэла Толкіна і нават знойдзеная ў кнізе «Дракула» Брэма Стокера «папрыка Гендл». І калі да кошту гастранамічных вынаходак у гурманаў былі пытанні, то да смаку — ніякіх там «паскудства, брат, і не пытайся», адны кампліменты...



Не сумна было ў сталічных кнігарнях, дзе адна за адной праходзілі кніжныя прэзентацыі і сустрэчы з аўтарамі, у тым ліку зладжаныя Выдавецкім домам «Звязда». Так, у «Кнігах&кніжачках» чыталі твор Генадзя Аўласенкі «Снегавік і вясна», у «КнігаПолісе» абмяркоўвалі «Уцёну ў Францыі» Яны Явіч. А паралельна на розных пляцоўках у павільёне «БелЭкспа» нашы калегі правялі адмысловую экалагічную віктарыну, прадставілі кнігі Віктара Ляскоўскага «Антошкава шчаня», Дзмітрыя Юртаева «Ні секунды цішыні», маляўнічае выданне «Акварэльны сусвет Вячаслава Паўлаўца» і прысвечаны юбілею маладзёжнага руху выдавецкі праект «У рытме імклівых гадоў...». Часопіс «Маладосць» зладзіў для маладых літаратурных крытыкаў і тых, хто толькі марыць імі стаць, круглы стол з удзелам вопытных даследчыкаў літаратуры і майстар-клас са шкоднымі парадамі «Як не трэба пісаць рэцэнзіі», а таксама падвёў вынікі конкурсу «Слаўная кампанія: рэANIMAцыя», прысвечанага пісьменнікам XIX стагоддзя...

— Мама, глядзі, вось такая самая кніжка, як ты нам абяцала! — звініць патрабавальны галасок каля стэнда з дзіцячай літаратурай. Мінчанка Яўгенія Капыцька, якая вывучае асартымент разам з двума сынамі, задавальняе просьбу маленькіх кнігалюбаў і расказвае, што ўжо гадоў пяць не прапускае ніводнай кніжнай выстаўкі і ніколі не сыходзіць з пустымі рукамі: «Вось і сёння амаль на сто рублёў накупілі: дзіцячыя энцыклапедыі, некалькі перакладных мастацкіх кніг, прыгожае выданне Караткевіча, вучэбныя дапаможнікі... Каб набыць тое самае ў крамах, давялося б патраціць больш часу і грошай, а на Мінскай кніжнай выстаўцы заўжды хапае цікавых навінак».

Пенсіянерка Галіна Трафімава гаворыць, што прыйшла мэтанакіравана «на Рэзніка», які прадстаўляў сваю новую дзіцячую кнігу «Цяпла не хоча быць клоўнам», але пасля сустрэчы з любімым паэтам-песеннікам зацікавілася наступнай прэзентацыяй, паслухала яшчэ музычную праграму ад дэлегацыі Казахстана, абышла стэнды выдавецтваў з розных краін — і не пашкадавала: «Набыла сабе кнігу пра айца Іаана Крэсцьянкіна, нават не ўтрымалася, колькі старонак «праглынула» тут жа, седзячы за столікам, а ўнучцы купіла дапаможнік па ментальнай арыфметыцы, ведаю, што дзеці даўно такі шукалі».

Пагаджаюцца з тым, што хапае на што паглядзець і што пачытаць, і самі ўдзельнікі выстаўкі. Так, прадстаўнікі расійскага выдавецтва «Маладая гвардыя», якое пасля заключэння прамога дагавора з «Белкнігай» атрымала магчымасць рэалізаваць у нашай краіне свае выданні наўпрост (а значыць, зрабіць іх больш даступнымі для чытачоў), не толькі адзначылі высокую цікавасць беларусаў да сваіх кніг і аўтараў, але, у сваю чаргу, былі прыемна ўражаныя некаторымі беларускімі выдавецкімі праектамі і нагледзелі для сябе новых патэнцыйных беларускіх аўтараў. Наогул жа на стэндзе Расійскай Федэрацыі, якая стала цэнтральным экспанентам выстаўкі, урад Масквы прадставіў больш як 500 найменняў кніг і новыя творчыя праекты.



**КРУГЛЫ стол, які адбыўся ў межах XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу ў сталічным Усіхсвяцкім храме, сабраў кіраўніцтва дзяржаўных ведамстваў і грамадскіх арганізацый, а таксама прадстаўнікоў хрысціянскіх канфесій, выдаўцоў, пісьменнікаў, аглядальнікаў па культуры ў вядучых СМІ, моладзь. Тэма, заяўленая як «Роля кнігі ў фарміраванні культуралагічнага, духоўна-маральнага развіцця грамадства», у працэсе размовы атрымалася значна глыбейшай і закранула праблемы перадачы найважнейшых духоўных каштоўнасцяў ад пакалення, для якога кніга была найлепшым падарункам, — пакаленню, якое чытае добра калі з экранаў сучасных гаджэтаў...**

Размова па сутнасці

# АДСЮЛЬ



Мітрапаліт Павел.



Фёдар Поўны.



Ігар Бузоўскі.



Мікалай Чаргінец.

«Прыгадайце — калі толькі прыйшло тэлебачанне, гаварылі, што не застанецца ні тэатра, ні кніг, будзе толькі адно суцэльнае тэлебачанне. Потым тое самае адбывалася з распаўсюджваннем інтэрнэту, які, здавалася б, мусіў усё замяніць і адсунуць кнігу ў нябыт. Тэхніка за апошнія гады крочыла вельмі далёка, але як бы мы ні гаварылі пра кнігу, яна застаецца запатрабаванай, — адзначыў у пачатку размовы **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі,** — бо яна дае нам магчымасць самім творча асэнсоўваць жыццё: мы самі сабе рэжысёры, мастакі і ўдзельнікі падзей, пра якія расказвае кніга, і перадусім гэта кніга жыцця — Біблія, якая застаецца самай запатрабаванай і перакладзенай на максімальную колькасць моў свету».

Якія задачы сёння мусіць выконваць кніга, каб адпавядаць выклікам часу, задаў вектар далейшай размовы **намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ**: павінна яна накіроўваць на духоўнасць, мараль або мусіць стаць выключна камерцыйным прадуктам і ацэньвацца грамадствам і прафесіяналамі з пункту гледжання «падабаецца/не падабаецца»? «Нам — і Міністэрству інфармацыі, і Саюзу пісьменнікаў, і выдаўцам — трэба паспрабаваць знайсці тую агульную стратэгію, якая дазволіць кнізе развівацца», — адзначыў Ігар Бузоўскі.

Кніга, падкрэсліў **настаяцель Усіхсвяцкага прыхода протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ**, з'яўляецца часткай культуры, гістарычнай памяці і скарбніцай духоўнага вопыту нашых продкаў. «І мне здаецца, што праблема цяперашняга часу не ў тым, што кніга пераходзіць з папяровага ў электронны фармат, а ў тым, што яна можа наогул сысці з любога фармату», — зазначыў ён.

Фёдар Поўны, які прадставіў адмысловае выданне «Святога Евангелля», правёў лагічны ланцужок ад духоўных кніг наогул да ролі духоўнасці як базісу ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці. Ён расказаў пра цікавы навуковы эксперымент, які правёў на зары інтэрнэту філолаг-тэарэтык Віктар Мартынаў — прыдумаў і распрацаваў універсальны семантычны код, з дапамогай камп'ютара перавёў яго ў лічбы, каб атрымліваць своеасаблівы адбітак любога рэальнага тэксту: «Спачатку даследчыкі індэксавалі тэксты навін, інтэрнэт-бібліятэкі і форумы, віртуальных персанажаў, а потым прыдумалі анкету, якая давала «адбіткі» рэальных людзей. Высветлілася, што ўсе яны паддаюцца сістэматызацыі і адпавядаюць семантычным кодам свяшчэнных рэлігійных кніг і некаторых асабліва важных для чалавецтва філасофскіх трактатаў і мастацкіх тэкстаў... Сталі правяраць асноўныя тэксты свяшчэнных кніг — аказалася, што зададзеныя імі індэксы былі пакладзеныя ў аснову групавых індэксаў розных устойлівых груп, то-бок нацыянальных культур. Як няцяжка здагадацца, славяне — народ Новага запавету. Дагэтуль царкоўнаславянская мова духоўна змацоўвае ўсе славянскія народы, а Евангелле з'яўляецца кодам нашай ідэнтычнасці. На жаль, сёння мы назіраем спробы падмены духоўных паняццяў і ўзлому гэтага коду, замены яго на чужынскія. Але, пазбаўляючы нацыянальную самасвядомасць духоўнай асновы, народ выракае сябе на выміранне...»

* * *

**Гісторык, тэлевядучы, пісьменнік і сцэнарыст Вячаслаў БАНДАРЭНКА**, які прадставіў сваю новую кнігу з серыі «Жыццё знакамітых людзей» пра вядомага ва ўсім праваслаўным свеце расійскага пастыра айца Іаана (Крэсцьянкіна), зазначыў, што гэта выданне ў інтэрнэт-крамах карыстаецца попытам: яго замаўляюць чытачы з Беларусі, усіх рэгіёнаў Расіі, Украіны, Германіі, ЗША, Ізраіля. Пісьменнік выказаў меркаванне, што ў падобных кнігах важны не столькі аўтар, колькі герой, пра якога расказвае кніга, — і калі гэта сапраўды цікавы чалавек,

«Сёлета выстаўка стала рэкорднай як па колькасці праведзеных у межах форуму мерапрыемстваў, так і па колькасці наведвальнікаў — больш чым 61 тысяча чалавек, і прадстаўнікоў краін-удзельніц, іх 37, прычым упершыню прадставілі свае асобныя стэнды Азербайджан, Украіна, Казахстан, Ізраіль, Польшча, Грэцыя і Кітай. У рабоце ММКВК узяў удзел 441 экспанент, з іх 164 замежныя», — рэзюмаваў старшыня Савета кніжных выставак і кірмашоў, што ладзяцца ў дзяржавах — удзельніцах СНД, **генеральны дырэктар выдавецтва і кнігагандлёвага ТАА «Макбел» Дзмітрый МАКАРАЎ**. Дыпломы арганізатараў атрымалі, дарэчы, выдавецтва «Аверсэў» — за найлепшую тэматычную экспазіцыю, а таксама Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа.

**Намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ** адзначыў, што межы выставачнага павільёна ўжо відавочна сталі цесныя для такога маштабнага форуму, а таму цалкам правільна, што ён праходзіў сёлета на розных пляцоўках: «Усе гэтыя творчыя сустрэчы, насычаныя і цікавыя дыскусіі, я спадзяюся, паслужаць таму, каб наша наступная выстаўка была яшчэ больш маштабнай і напоўненай разнастайнымі мерапрыемствамі».

XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш стала часткай гісторыі, але мы чакаем старых і новых удзельнікаў праз год, і незалежна ад таго, хто прыедзе першы, а хто дваццаць сёмы раз, у Мінску гасцям заўжды рады і з задавальненнем прымуць новых аўтараў, выдаўцоў і новыя добрыя кнігі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА і Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# КНІГА ЯК МАСТАЦТВА

**У апошнія дні работы XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі былі падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу «Мастацтва кнігі». За галоўныя ўзнагароды ў 14 намінацыях пазмагаліся 158 выданняў ад 40 устаноў. У выніку галоўны прыз — у намінацыі «Трыумф» — атрымаў «Вялікі гістарычны атлас Беларусі», выпушчаны ў 4-х тамах «Белкартаграфіяй» Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. І гэта нагода для гонару.**



Праца над «Атласам» вялася на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Вучоныя, картографы, архівісты сумесна збіралі розныя ўнікальныя карты, якія ў выніку трапілі пад вокладку шматтомніка. У выданне ўключаны карты асобных рэгіёнаў, планы гарадоў, схемы ваенных сутыкненняў. Змешчана там і буйнамаштабная Генеральная карта, рэпрадукцыі старадаўніх картаў. Такім чынам, атлас яскрава паказвае нам пакручасты лёс нашай краіны і яе жыхароў ва ўсе эпохі.

Пераможцы былі вызначаны і ў іншых, таксама важных і ганаровых намінацыях. **Выдавецкі дом «Звязда»** прызнаны найлепшым у намінацыі **«Эўрыка»**, дзе вызначалі самыя добра аздобленыя навуковыя і навукова-папулярныя выданні. Пераможцам выйшла кніга «У рытме імклівых гадоў... Нарысы гісторыі камсамола Беларусі». Серыя «100 вершаў» выдавецтва **«Мастацкая літаратура»** адзначана ў намінацыі **«Сцяжынкамі роднага краю»**, прымеркаванай да Года малой радзімы. Пераможцам стаў зборнік **«Зямля бацькоў святая»**. Дыпломам першай ступені ў гэтай намінацыі адзначаны альбом Уладзіслава Цыдзіка «Бачу Беларусь такой. I am seeing Belarus like that», які пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда».

Ганаровы знак-сімвал «Залаты фаліянт» і дыплом пераможцы ў намінацыі **«Літфармат»** прысуджаны выдавецтву «Мастацкая літаратура» за кнігу Алеся Разанава **«Такая і гэтакі: талакуе з маланкай дождж»**. Кнігі для самых маленькіх чытачоў былі прадстаўлены ў намінацыі **«Разам з кнігай мы расцём»**. Тут пераможцам абранае выданне **«Залатая шарсцінка, срэбраная павуцінка»** выдавецтва «Медыял».

У намінацыі **«Залатыя скрыжалі»** вызначалі найлепшыя даведачныя і энцыклапедычныя выданні. Цалкам заканамерна, што пераможцам тут аказалася выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» за падрыхтоўку і выданне персанальнай трохтомнай энцыклапедыі **«Янка Купала»**.

**«За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны»** — перамогу ў намінацыі з такой назвай атрымала праца супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **«Першы Буквар: факсімільнае ўзнаўленне: да 400-годдзя выдання»**. Гэта прыгожа аздобленыя тры кнігі ў падарункавай скрыні. У намінацыі **«Духоўнасць»** дыплом пераможцы ўручаны выдавецтву «Беларуская навука» за кнігу Вольгі Лабачэўскай **«Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы»**.



У намінацыі **«Арт-кніга»** былі прадстаўлены найлепшыя выданні па выяўленчым мастацтве, факсімільныя, рэпрынтныя, бібліяграфічныя. Найлепшым тут стала выданне Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — **«Веліч і слава Беларусі і Расіі»** Ігара Марзалюка. Фотаальбом **«Беларусь. Пасланне свету»** выдавецтва «Беловагруп» стаў найлепшым у намінацыі **«Фотапогляд»**.

У спецыяльнай намінацыі **«Садружнасць»** — сумесных выдавецкіх праектаў найлепшай прызнана кніга Наталлі Ігнаценкі **«Як транспарт дапамог сябрам Маскву спазнаць»** («Беловагруп», Мінск і «МП-пресса», Масква). У спецыяльнай намінацыі **«У люстэрку часу»** дыплом пераможцы прысуджаны выданню **«Паштовыя маркі Рэспублікі Беларусь. 2017»** выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта». **«Падручнікам новага стагоддзя»** стала кніга выдавецтва «Аверсэў» **«Буквар для дашкольнікаў»**.

Для найлепшых ілюстратараў, фатографаў і дызайнераў прадугледжана агульная намінацыя пад назвай **«Майстэрства»**. Такім чынам, найлепшым ілюстратарам прызнаны Вячаслаў Валынец за кнігу **«Казкі для гарэз»** выдавецтва «Харвест». Найлепшы **фатограф — Міхась Раманюк** за ўнёсак у беларускую нацыянальную мастацкую фотакультуру. Найлепшы **дызайнер — Міхал Анемпадыстаў** за ідэю, аўтарскую канцэпцыю, тэкст і мастацка-графічнае выкананне выдання «Колер Беларусі». Міхала Анемпадыстава ўжо год як няма з намі — гэта пасмяротнае прызнанне заслуг таленавітага творцы — узнагароду атрымлівала яго жонка Алена Дашкевіч.

**Старшыня журы нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхась БАРАЗНА** адзначае:

— Часам мяне запытваюць, чым гэты конкурс адрозніваецца ад папярэдняга? Адкажу, што сённяшні конкурс унікальны. Не ўсё золата блішчыць і не ўсё такім выглядае. Магчыма, калі мы глядзім на паліцу кніг-пераможцаў, то бязмежны талент выдаўцоў, літаратараў, мастакоў, дызайнераў бачыца даволі сціплым. Але, паверце, як ніколі цікавых кніг у гэтым сезоне. Яшчэ адна адметнасць у тым, што аднавіліся і актуалізаваліся многія прозвішчы, якія з'яўляюцца стаўпамі беларускага мастацтва кнігі. Нават невялічкая кніжыца, на якой надрукавана мілая, утульная, камерная праца Аркадзя Астаповіча, таксама стала актуальнай і сучаснай для многіх беларусаў. Мы бачым графічныя творы Арлена Кашкурэвіча, Васіля Шаранговіча, Міхала Анемпадыстава. Беларуская культура заўсёды злучала традыцыі і сучаснасць, эксперымент. І акурат сёлета ўдалося ўсё гэта спалучыць надзвычай выдатна.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

# МАРАЛЬ

## У Мінску абмеркавалі ролю літаратуры ў культурным і духоўным развіцці грамадства

а расказ пра яго жыццё не мастацкая выдумка, а глыбокае даследаванне, заснаванае на фактах і сведчаннях сучаснікаў, то такая кніга будзе цікавай для шырокай аўдыторыі.

— А ці ёсць у нас сёння тыя асобы, персаналіі, пра якіх варта пісаць у кнігах? Тая літаратура, што стаіць на бачным месцы ў кнігарнях і бібліятэках — яе чытаюць? — пацікавіўся ў выдаўцоў і аўтараў Ігар Бузоўскі.

**Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман МАТУЛЬСКІ** заўважыў, што агітаваць кагосьці чытаць — справа няўдзячная, але трэба даць чалавеку максімальна шырокі выбар, чым, уласна кажучы, бібліятэкі і займаюцца. «Але вельмі прыкра ўсведамляць, што кніга ператварылася ў тавар — умоўна кажучы, кнігу ацэньваюць, як тую ж цагліну. Каб гэтага пазбегчы, трэба перагледзець механізм, па якім кнігі трапляюць у бібліятэкі — не на рынкавых падставах, а нейкім іншым чынам, як сацыяльна значны праект. Асабліва важна, каб такія кнігі без перашкод траплялі да маладога пакалення, якое, уласна, яны фарміруюць — да дзяцей і падлеткаў. Мы, са свайго боку, праводзім і гатовыя даць зрэз попыту, што сёння найбольш ахвотна чытаюць».

**Пісьменніца, кандыдат гістарычных навук Наталля ГОЛУБЕВА** перасцерагла ад празмерна адвольнага абыходжання з гістарычнымі асобамі, якіх у пагоні за рэйтынгам і чытацкай цікавасцю аўтары вырываюць з кантэксту, ігнаруючы рэальныя факты, і перамяшчаюць у іншую эпоху, фантазіруюць, «а як магло б быць». «Хочацца аднавіць праўдзівую гісторыю, якой яна была насамрэч, без нагнятання і без прыўкрас — у прыватнасці, з гэтай мэтай разам з «Беларускай энцыклапедыяй імя Петруся Броўкі» мы выпусцілі кнігу «Кірыл Мазураў. Аб чым маўчаў час», якая расказвае пра падзеі не так даўно мінулага XX стагоддзя, не ствараючы фэнтэзі з удзелам знакамітых асоб, а захоўваючы сваю гістарычную памяць».

**Дырэктар згаданага выдавецтва Уладзімір АНДРЫЕВІЧ** дадаў, што ў культуралагічным і духоўным развіцці грамадства ёсць наступная праблема: прадстаўнікі старэйшага пакалення раслі яшчэ ў савецкі час, у іншай краіне, і выхоўваліся ў пэўным маральна-этычным кірунку, умоўна кажучы, будаўніка камунізму. Але ў 90-я гады разам з палітычным і эканамічным крызісам адбыўся і духоўны, і тая пастка паглынула цэлае пакаленне, якое вырасла з устаноўкай «Якая мараль? Чыста канкрэтыка», а таму цяпер губляецца, як, у якім кірунку выхоўваць ужо сваіх дзяцей. «У нас ёсць асобы, на якіх варта арыентавацца — так, у свой час мы выдалі для дадатковага чытання школьнікаў 12 кніг пра асветнікаў Беларусі, кніжныя серыі «Маленькі прафесар», «Самыя-самыя»... На мой погляд, у грамадстве трэба вяртаць павагу да Яе вялікасці Кнігі, бо чалавек, які чытае, — гэта думаючы чалавек, ён не толькі больш адукаваны, культурны, але ў рэшце рэшт і больш патрыятычны».

* * *

Шмат гаварылі падчас круглага стала і пра папулярызацыю чытання — як на дзяржаўным узроўні (прыкладам, **епіскап Юрый КАСАБУЦКІ** прапанаваў запусціць праз СМІ маштабную сацыяльную рэкламу добрай кнігі), так і праз школу, а таксама на ўзроўні кожнай сям'і.

**Кіраўнік Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук прафесар Іван САВЕРЧАНКА** адзначыў, што ў нашых школах вельмі добра наладжана выкладанне рускай літаратуры — нават з Усерасійскага конкурсу выкладчыкаў рускай літаратуры менавіта нашы настаўнікі прывезлі 1-е месца, — але можна яшчэ ўдасканаліць і зрабіць больш сучаснымі падручнікі і хрэстаматыі. Для гэтага, на яго думку, трэба зрабіць так, каб усе свежыя выданні кніг расійскіх і беларускіх пісьменнікаў як мага хутчэй траплялі ў Нацыянальны інстытут адукацыі і яго спецыялісты маглі б вывучаць іх і рэкамендаваць уключыць найлепшыя творы ў школьную праграму, а дзеці атрымлівалі доступ да выдатных узораў якаснай мастацкай літаратуры.

На думку **старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая ЧАРГІНЦА**, каб быць цікавым сваім чытачам, сучасны аўтар мусіць разумець сваю ролю ў грамадстве: пісаць глыбока, добра, даходліва і зразумела, але пры гэтым скіроўваць увагу аўдыторыі на глабальныя праблемы свету — пагрозу вайны і тэрарызм, голад, дэфіцыт вады і г. д. «Пра гэта гаварылі ўсе ўдзельнікі сёлетняга сімпозіума літаратараў, — падкрэсліў ён, — што пісьменнікі павінны дапамагаць чалавеку стаць больш спагадлівым, высокамаральным... Але нават таленавітым пісьменнікам, а іх сёння многа, патрэбная дапамога з тым, каб іх ідэі знайшлі водгук у моладзі — магчыма, варта было б зладзіць на тэлебачанні сустрэчы пісьменнікаў з чытачамі ў фармаце «адзін супраць усіх», і няхай там ідуць самыя гарачыя спрэчкі — у спрэчках і нараджаецца ісціна».

«Дадам рэпліку з пункту гледжання бацькоў, — заўважыла **вядучая культурных тэлепраграм на «Беларусь 3» Ганна ПАНЦЯЛЕЕВА**, — многія нашы дзеці не чытаюць наогул, яны ў лепшым выпадку глядзяць фільмы паводле твораў, а значыць, не ўмеюць пісаць сачыненні, не ўспрымаюць вялікі аб'ём літаратуры надалей у інстытуце... Пачынаць трэба з сям'і, з таго, каб бацькі збіралі сямейную бібліятэку і прапаноўвалі кнігі з яе дзецям...»

З гэтай адозвай пагадзіліся ўсе ўдзельнікі сустрэчы — намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі адзначыў, што падобныя сустрэчы трэба ладзіць часцей, бо сёння іх відавочна не хапае, а Мітрапаліт Павел дадаў, што да ўдзелу ў абмеркаваннях неабходна абавязкова прыцягваць бацькоў і педагогаў: «Перш чым заняцца дзецьмі, трэба заняцца дарослымі і данесці да іх заклапочанасць: куды мы ідзём, што нас чакае?»

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!

Собрание акционеров состоится 29 марта 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 17 в актовом зале.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2018 год и основных направлениях деятельности в 2019 году.
2. Отчет ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2018 год.
3. Отчет наблюдательного совета общества о проделанной работе в 2018 году.
4. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2018 год.
5. О распределении прибыли и убытков.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об определении размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Киселева, 26а, приемная генерального директора) в рабочие дни в период с 12 по 28 марта 2019 г. с 13.00 до 15.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Акционерам, передавшим на основании доверенности свои полномочия на участие в общем собрании членам наблюдательного совета, участие в собрании не обязательно.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании, – в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 17, в актовом зале (3-й этаж). При себе иметь следующие документы: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 600024712

## ОАО «Светлогорскпромстрой» уведомляет о проведении аукциона по продаже имущества

Лот № 1:

экскаватор колесный ЭО-33211, 2000 год выпуска, двигатель ЯМЗ-238 № 079212360, технически исправен, стоимость – 9612 руб. – цена с учетом НДС 20 %.

Лот № 2:

автомобиль МАЗ-5551А2, 2008 год выпуска, кузов (рама) Y3M5551A280001318, максимальная допустимая масса 18200, цвет белый, технически исправен, стоимость – 12744 руб. – цена с учетом НДС 20 %.

Лот № 3:

автомобиль МАЗ-5336А5-320, 2008 год выпуска, кузов (рама) Y3M5336A590000339, максимальная допустимая масса 16500 кг, цвет белый, технически исправен, стоимость – 16956 руб. – цена с учетом НДС 20 %.

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников.

**Аукцион состоится 28.02.2019 г. в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 4.**

Заявления на участие в аукционе и прилагаемые документы принимаются с даты настоящей публикации по **27.02.2019** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 4.

Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Продавец: ОАО «Светлогорскпромстрой».

Организатор аукциона: Ликвидатор ОАО «Светлогорскпромстрой». Месторасположение имущества: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 4.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с BY45BLBB30120490564355001008 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ 304, адрес банка: г. Светлогорск, ул. Мирошниченко, 25, код банка BLBBBY2X, УНП 490564355. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по лоту (указывается № лота, дата аукциона). Задаток перечисляется в размере, указанном в настоящем извещении, не позднее указанного в извещении срока окончания приема документов на участие в аукционе. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Участникам, не признанными победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Победителем признается участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других участников. В случае если аукцион признан несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов. Результаты аукциона оглашаются публично в день проведения.

Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании Положения о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, представляются следующие документы: юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством); юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона; индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

Ознакомиться с объектом аукциона можно в дни приема документов на участие в аукционе у организатора аукциона. Контактное лицо для осмотра объектов: тел. 8 044 765-58-74, тел./факс 8 02342 2-08-08.

Предыдущее объявление о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» 27.11.2018.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БРЕСТСКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОЙ ЖЕЛЕЗНОЙ ДОРОГИ» БРЕСТСКАЯ ДИСТАНЦИЯ ГРАЖДАНСКИХ СООРУЖЕНИЙ

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Общая площадь, кв. м | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1.** Помещения, пл. 47,4 кв. м, расположенные в капитальном строении с инв. № 100/С-24898 (гараж на 2 бокса), расположенные по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. ГОБК (р-н локомотивного депо станции Брест-Центральный) | 190,90 | 19,09 | 47,4 | - | Хранение непродовольственных товаров (кроме взрывоопасных и легковоспламеняющихся), инвентаря, машин и механизмов; розничная торговля непродовольственными товарами (автозапчасти, автокосметика, автошины, строительные материалы) (кроме взрывоопасных и легковоспламеняющихся); услуги по обслуживанию и ремонту автомобилей |
| **ЛОТ № 2.** Помещения, пл. 47,3 кв. м, расположенные в капитальном строении с инв. № 100/С-24898 (гараж на 2 бокса), расположенные по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. ГОБК (р-н локомотивного депо станции Брест-Центральный) | 190,50 | 19,05 | 47,3 | - | |

**Условия**

1. Срок аренды – 3 (три) года.
2. С победителем аукционных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней будет заключен договор аренды.
3. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.
4. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона

**Реквизиты для перечисления задатка:** РУП «Институт недвижимости и оценки», Брестский филиал, BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10 , BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245

**Аукцион состоится 6 марта 2019 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81**

**Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. № 624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. № 14), – 10 базовых величин**

**Последний день приема заявлений – 5 марта 2019 г. до 17.00**

***Ранее извещение о проведении аукциона по продаже права аренды имущества Брестская дистанция гражданских сооружений опубликовано в газете «Звязда» от 28.08.2019 г.**

## Управляющий объявляет о проведении торгов по продаже имущества ОАО «Рыбхоз Соколовский Гусак»

**ЛОТ 2.**

| **Сведения о предмете аукциона (имущество расположено на производственной базе ОАО «Рыбхоз Соколовский Гусак» по адресу: 225104, Брестская область, Жабинковский район, д, Соколово, ул, Каштановая, 2** | Начальная цена, рублей (с НДС), бел. руб. | Сумма задатка, рублей (с НДС), бел. руб. | Минимальная величина первого шага, рублей (с НДС), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Автомобиль « Валдай» АЕ-57-32 | 2400,0 | 40,0 | 240,0 |
| Автомобиль Газ-3302 АЕ 02-92 | 4320,0 | 432,0 | 432,0 |
| Автомобиль Газ 53 АЕ 61-98 | 2400,0 | 240,0 | 240,0 |
| Автомобиль МАЗ 457043 АЕ 34-95 | 6000,0 | 600,0 | 600,0 |
| Погрузочно-разгрузочный комплекс МТЗ-82 | 3600,0 | 360,0 | 360,0 |
| Подъемник Опт-915 на базе трактора МТЗ-920 | 16920,0 | 1692,0 | 1692,0 |

Аукционные торги состоятся 14 марта 2019 года в 11.00 в административном здании по адресу: 225104, Брестская область, Жабинковский район, д. Соколово, ул, Каштановая, 2.

Заявление с пакетом документов подаются в срок до 13 марта 2019 года до 16.00 по адресу: Жабинковский район, д. Соколово, ул. Каштановая, 2. Контактные телефоны: (Велком) 8-044-5680670, (МТС) 8029-544-48-66. Задаток в размере 10 % стоимости имущества (лота) перечисляется на лицевой счет BY 37 BAPB 3012 2233 4001 1000 000 г. Минск, ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X. Шаг аукциона 10 %. Срок подписания договора купли-продажи в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.

УНП 290816615

## ООО «Расантехторг» (организатор аукциона) проводит 15.03.2019 г. торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по продаже имущества ООО «ТДИ-Инвест» (продавец)

| Лот № | 1 | 2 |
|---|---|---|
| Сведения о предмете электронных торгов | Автомобиль грузовой MERCEDES-BENZ 814 D, бортовой тентовый, гос. номер АН 3299-5, год выпуска – 1997, цвет – белый, номер кузова WDB6703241N060094 | Автомобиль грузовой MERCEDES-BENZ 812 D, бортовой тентовый, гос. номер АН 4149-5, год выпуска – 1997, цвет красно-белый, номер кузова WDB6703211N064468 |
| Начальная цена предмета торгов | 24 215 руб. 95 коп., без НДС | 14 867 руб. 22 коп., без НДС |
| Шаг аукциона | 5 % – 1 210 руб. 80 коп. | 5 % – 743 руб. 36 коп. |
| Сумма задатка | 10 % – 2 421 руб. 60 коп. | 1 486 руб. 72 коп. |
| Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с организацией торгов | 70 руб. 00 коп. | 70 руб. 00 коп. |
| Местонахождение предмета торгов | Минская обл., Логойский р-н, д. Алекшицы, ул. Центральная, 38 | Минская обл., Логойский р-н, д. Алекшицы, ул. Центральная, 38 |
| Р/с для перечисления суммы задатка | BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793 | |

Торги в электронной форме в процедурах экономической несостоятельности (банкротства) (далее – электронные торги) будут проведены 15.03.2019 г. в 9.00 , на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY, окончание –15.03.2019 г. в 17.00. Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить по тел. (8 029) 6703084, WWW.TORGI24.BY. Дополнительную информацию по лотам: продавец ООО «ТДИ-Инвест», в лице управляющего по банкротству ООО «Лигал Консалт», директор Наумович Марина Михайловна, тел. (8 029) 7795659. Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «Расантехторг», – WWW.TORGI24.BY. Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10 % по каждому лоту принимаются по 12.03.2019 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Пуховичский пищекомбинат» в лице антикризисного управляющего Боброва Д. А. в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

**лот № 1: автомобиль грузовой бортовой тентовый МАЗ-533605, 2006 года выпуска, цвет – белый, регистрационный знак АН 7071-5, кузов (рама) № Y3M53360560000683, свидетельство о регистрации ДТС ОАА №273421 от 15.11.2013, инв. № 0001095. Объект расположен по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 21.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **5 040,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **504,00** бел. руб.);

**лот № 2: весовая с навесом общей площадью 12,3 кв. м, инв. № 602/С-55872, расположенной на земельном участке площадью 5,0852 га с кадастровым номером 624450100001001028 (право аренды) по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 21.** Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *водоохранная зона реки Титовка, пл. 5,0852 га.*

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **6 120,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **612,00** бел. руб.).

Шаг аукциона – 10 (десять) процентов.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.**

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

– заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

– для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

– для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

– для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

– для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанными победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформления участия в торгах определяется условиями о проведении торгов, ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **15.03.2019** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.03.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

Простая мова

# ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ

**«Ну, за Марыю Іванаўну!» — кажуць мужчыны, падымаючы трэцюю чарку. «Якую такую Марыю Іванаўну?» — не, не ды і спытае нехта з кампаніі. «А кожны за сваю... Каханую. Альбо любімую». Наша, напрыклад, ну вельмі цікавая жанчына — знешне, ды і нагогул... Цудоўна гатуе, вышывае крыжыкам, шмат чытае.**
**І тут вось што цікава — змест кнігі перавказвае лёгка, а вось тое, што напісана ў газетах... «Гэта ўжо нешта з маёй галавой? — спытала яна надоечы. — Я так чытаю? Ці вы так пішаце?»**
**Мы — хочацца верыць, не так.**

## ДЭФІЦЫТ

Горад, скрыжаванне, дзве жанчынкі наперарэз — заклапочана пытаюць (па-руску):

— Вы не падкажаце — недзе тут гарадок політэхнічнага?

Кажам, што гэта блізка, паказваем, як прайсці...

— І там жа, — перапыняюць, — вуліца Броўкі?

— Так...

Яшчэ раз паказваем і расказваем. Жанчыны слухаюць, усміхаюцца, дзякуюць (ужо па-беларуску), але не сыходзяць: яны трошкі разгублена дадаюць:

— Ну што б яшчэ ў вас папытаць, каб жывую мову паслухаць?

## КАМПЛІМЕНТ

Дзеду Валянціну ўжо за 80. Адзін жыве. Два разы на месяц да яго прыязджае дачка, два разы на тыдзень прыходзіць сацыяльны работнік. Больш візіцёраў, як правіла, няма. Хіба надоечы?

У дзверы нейкая маладзіца пазваніла — з нататнікам у руках, спытала, ці ёсць у яго дзеці школьнага ўзросту?

— Не, — прызнаўся гаспадар.

— Дзякуй, — штось «пісануўшы» ў блакнот, сказала візіцёрка.

— Вам шчыры дзякуй, — аж пакланіўся дзед.

— Гэта ж за што?

— Ды за камплімент.

## ВУЧЫСЯ, НЯБОЖА...

Горад, цырульня. Раней тут добрыя майстрыхі былі. Цяпер — новыя. Усе. Але ж зараз не да выбару — спешка.

Мусіць, згледзеўшы гэта, на касе пытаюць:

— А вы не супраць, калі манікюр вам зробіць вучаніца?

— ?

— Не хвалюйцеся: яна ўмее, да яе нават запіс ёсць, — лапоча адміністратар... І ўмольна дадае: — Ну трэба ж дзяўчыне вучыцца.

Хто б спрачаўся, тым больш што пазногці — не вушы, ды і дзяўчына досыць сімпатычная — з бэйджам на грудзях «Малады спецыяліст».

Заўважце — ужо не вучаніца!

З гэтай нагоды анекдот.

Раніца, бальніца, абход. «Прафесар, я чуў, аперацыю мне будзе рабіць студэнт. Гэта што — праўда?» — хвалюецца хворы. «Так, — адказвае доктар, — прычым выдатнік!» — «Але ж раптам у яго рука здрыганецца, раптам дрэнна ўсё зробіць? Што тады?» — «Тады мы яму двойку паставім».

З той жа «серыі» малюнак мастака: аперацыйная зала, стол, на ім — пацыент (з-пад прасцінкі ногі тырчаць). Побач — ці не той жа хірург-студэнт: паказвае прафесару (ён у дзвярах з'явіўся) выдалены орган і пытае: «Гэта хіба не апендыкс?»

Што ўжо казаць пра пазногці...

## РАБІ, ШТО ТРЭБА

Чым бы дзіця ні цешылася...

Тады вельмі «модна» было збірацца разам, хадзіць у лес, капаць зямлянкі. Адну — яны прыдумалі — для ўсіх, а другую — камандзірскую.

Доўга працавалі: варочалі зямлю, потым «падлогі» ўсцілалі яловымі лапкамі, столь перакрывалі жэрдкамі, для маскіроўкі зверху на іх клалі квадрацікі дзёрну... Вось-вось, здаецца, і засяліліся б, «зажылі»...

Зрабіць гэта перашкодзіў дзядзька Васіль. Ён выпадкова натрапіў на «лагер», агледзеўся там, зазірнуў унутр пабудоў, убачыў, як сагнуліся-правіслі жэрдкі пад цяжарам дзірвану і неяк жа давёў юным «партызанам», што так і да смерці блізка...

Малыя пасля гэтага, не дужа шкадуючы працы, «разбамбілі»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ўласны «лагер» сіламі, не тое сваёй, не тое варожай авіяцыі, іншы занятак знайшлі...

Павырасталі, ды што там, нават састарэлі ўжо. Рэдка сустракаюцца. Як зямлянкі будавалі, помняць. Як «бамбілі» іх — таксама. Дзядзьку Васіля?

Ну, здаецца, быў такі...

## ХТО ПРАЦУЕ, ТОЙ І МАЕ?

Іванаўна адна гадуе сыноў — двух, змалку...

Цяпер, дзякуй богу, яны немаленькія. Адзін дык нават дарослы, можна сказаць. Праўда, не зарабляе, ва ўсякім разе — пакуль. І ў яе зарплаты як кот наплакаў, аліментаў — таксама. А да ўсяго — кватэра аднасна новая. Калі засяляліся, — там голыя бетонныя сцены былі.

Але ж яны разам усё сплавалі і... Грошай трохі збяруць (з усіх магчымых і немагчымых крыніц) — глядзіш, нешта зробяць ці купяць, потым — зноў збіраюць...

Хоць гэта і вельмі цяжка! А ўжо ж марудна... «Да 55, пакуль мне на пенсію, наўрад ці ўсё паспеем, — перажывала жанчына, — а потым і пагатоў ужо».

Цяпер — «павесялела», не плачацца: «пасунулі» пенсійны ўзрост, з'явіўся шанц.

## РОЗНЫЯ ЧАСЫ... І НОРАВЫ

У чэргі некалі запісваліся, у іх адзначаліся, стаялі (на мэблю, дываны, машыны — гадамі, на жыллё — дык нават дзесяцігоддзямі)! Там жа сварыліся, біліся, знаёміліся, прызнаваліся ў каханні...

Цяпер вось такога, можна сказаць, няма. Прыходзіш на пошту, у банк ці паліклініку, націскаеш на маленькую кнопачку, бярэш паперку з нумарам электроннай чаргі і стой сабе ці сядзі — чакай, пакуль не паклічуць.

Але ж гэта — калі кнопачка тая працуе, калі не — усё вяртаецца на кругі свае:

— Хто ў 401-ы? Усе?! — віруе натоўп у паліклініцы. — Вы апошні?

— Я.

— А хто перад вамі?

— Вось тая маладая дзеўка...

«Хм... Раней такіх не было, — з даверлівай усмешкай паведамляе нам пажылы мужчына, што стаіць побач. — Вось старыя дзеўкі — тыя былі. Іх яшчэ векавухамі звалі. А маладых... Паслухайце: іх жа і цяпер, мусіць, няма? Гадоў да 14-15 яны ж дзеці яшчэ, потым адразу жанчыны».

## «ЧУМА» ХХІ СТАГОДДЗЯ

Мусіць, яшчэ раз (і ці апошні?): блытае людзей сусветная павуціна... Ці яны ў ёй, як мухі...

Касціха за 30 вёрстаў на курсы ў райцэнтр ездзіла, камп'ютар асвойвала. Як высветлілася, не для таго, каб рэцэпты ды выкрайкі шукаць, каб з дачкой ды зяцем па скайпе размаўляць, — каб жаніха знайсці.

Спісалася з нейкім, прыехаў. Другі месяц гасцюе: смачна есць, позна спіць, потым, па-гаспадарску адставіўшы пуза, у споднім ходзіць па хаце і курыць. «Ты нашто яму дазваляеш? — крадком спытала суседка. — Ён жа ўсё запаскудзіць тут, закуродміць?» — «Ну і няхай сабе, — з усмешкай адказвае Касціха, — затое ў доме мужчынам пахне!»

З таго форсу і яе саму ўжо не пазнаць: валасы начарніла, бровы падвяла, вусны кожную хвіліну фарбуе...

— Ён мне, — хваліцца, — і дроў, і вады ў хату нанасіў, сцежкі ад снегу расчысціў... Замуж кліча. Але ж у вёсцы, мне кажа, жыць не прывык. Хоча, каб я тут свой дом прадала і да яго ў горад паехала...

— А ты ўжо што — і вушы развесіла? Слухаеш?! — злуецца суседка. — Ды ў яго ж, паглядзі, на твары напісана, што жулік, што ён і вокам не міргне — усё тут прадасць. А цябе, дурную, можа, і звязе куды... На паўгода. Потым жа — грошы патраціць і кіне, пойдзе сабе новую жонку шукаць. А ты куды вернешся?

— Ну вось чаму ты такая? Чаму ты не верыш людзям! — не разумее суседку Касціха...

Што цікава — жанчына вясковая...

Пра тое, як падобныя жаніхі падманвалі, на вялікія грошы разводзілі гарадскіх, ці не ўсе ўжо і чулі, і бачылі. «Хвароба» (ці нават эпідэмія?) дайшла да вёсак.

Прычыны?

Знаёмая акушэрка расказвала пра адну з маладзенькіх парадзіх. Ёй, беднай, 15 не было. «Ранавата», «І як жа так?» — гаварылі медыкі прымаючы роды. «Кінаў нагледзелася», — адказала ім дзяўчынка-маці.

## МІНІСТЭРСТВА ПАПЯРЭДЖВАЕ...

Анекдот: «У кожнага мужчыны павінны быць порткі, у якіх сорамна выйсці ў краму».

Калі яны, вось такія, выкідаюцца і купляюцца новыя? Ды калі мужчына кладзецца ў бальніцу ці едзе ў санаторый.

Што так, тое так, але ж — было, бо цяпер, здаецца, ужо ніхто нічога не саромеецца (а дзіркамі на каленях дык нават ганарацца) — гэта па-першае. А па-другое, на змену порткам прыходзяць шорты. Іх цяпер многія носяць дома. І ў іх жа маладыя насельнікі студэнцкіх інтэрнатаў выходзяць пакурыць — восенню-зімой, на вуліцу...

Як папярэджвае Міністэрства аховы здароўя, курэнне вельмі небяспечнае — развіццём анкалогіі, хвароб сэрца, сасудаў... А вось такое — у шортах і сланцах на холадзе — мусіць, не толькі імі.

## ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ

Ягораўна з паўгода назад яшчэ дужай была, сама ў кухні столь пабяліла, новыя шпалеры паклеіла. І ў садзе-гародзе парадак трымала: чаго там толькі не расло! Нявестка з унучкай тады часцяком наязджалі — адпачывалі ды і з сабой набіралі ўсяго-ўсяго...

Ягораўна аддавала, нічога ім не шкадуючы, бо сірацінкі ж, бо сынок (адзіны яе!) пяць гадоў як зямельку парыць — памёр, пакінуў іх.

Як ні дзіўна, сэрца ў маці тады не разарвалася, але ж балець стала.

Вось і надоечы яе зусім прыхапіла: на «хуткай» забралі, тры тыдні ў кардыялогіі адляжала. А сталі выпісваць, — не ведае, што і рабіць: хата халодная, сама ледзь жывая... Папытала ў нявесткі, можа, пад'едзе, забярэ яе з бальніцы, завязе дамоў, дапаможа там трохі асвойтацца. Тая адказала, што не зможа — у яе не атрымаецца. «Ну тады, — спытала свякроў, — можа, возьмеце да сябе, хоць на тыдзеньчык, пакуль падужэю?» — «А куды? — развяла рукамі нявестка. — У старой кватэры — кватаранты жывуць, на год дагавор заключаны, у гэтай — мы з дачкой. Вас няма дзе спаць палажыць».

Маці — а што было рабіць — паехала дамоў. Адна. Таму па дарозе, хоць і нельга было, думала пра нябожчыка-сына, які б у дошку разбіўся, а ёй дапамог! Міжволі ўспамінала, як даваліся ім (і ёй жа таксама!) грошы на абедзве тыя кватэры ды ўсё іх «начынне», крыўдзілася на нявестку і ўнучку, якім аддавала апошняе і якія...

Дома ёй таксама нельга было насіць дровы і ваду, мерзнуць у стылай хаце, паліць у печы, плакаць...

Але не плакаць яна не магла!

...І на гэты раз «хуткая» ўжо не паспела.

## ЧАС СТРАТ І ЗНАХОДАК

...На дзевяностым годзе жыцця пісьменніца Лідзія Арабей (светлай памяці!) наракала зрэдчас на памяць, прычым ці не найбольш, калі гублялася... слова. «Ну вось жа, — злавала, — круціцца яно ў галаве... І патрэбнае *(пісала яна да апошняга)*, а ўспомніць ну ніяк не магу».

«Час пошукаў» вымяраўся, бывала, гадзінамі, днямі і нават тыднямі, пасля якіх страта раптам з'яўлялася, аднекуль выплывала — сапраўдным падарункам!

Вось як мне надоечы кароткае:

*Наперадзе*
*усё твая сцежка —*
*Ты крышачку*
*толькі прайшла...*
*Хай з вочак*
*не сходзіць усмешка,*
*Хай сэрца*
*не страціць цяпла!*

Гэта, відавочна, пісаліся да нейкай даты, некаму. А вось каму?

Некалі, можа, успомніць ці сустрэнецца той чалавечак? Пакуль жа проста цікава, ці далёка зайшоў?

**Валянціна ДОЎНАР.**

Калекцыя

# МЕСЦА ЎСПАМІНАЎ — РАТУША



**У Чачэрскім гісторыка-этнаграфічным музеі, які знаходзіцца ў ратушы — помніку архітэктуры, пачаўся выставачны праект, асновай якога сталі прадметы, што былі ў свой час перададзеныя жыхарамі горада і такім чынам папоўнілі музейныя фонды і экспазіцыйныя паліцы. І першая выстаўка з гэтага фонду — Неанілы ШАЎЦОВАЙ. Калекцыя васьмідзесяцігадовай жыхаркі самая шматлікая — 523 экспанаты з пачатку і сярэдзіны мінулага стагоддзя. Тут фатаграфіі і паштоўкі рэвалюцыйнага часу, пяцідзясятых — сямідзясятых гадоў, арыгінальныя рэчы побыту, посуд, прас, узнагароды бацькі-франтавіка, нават парфумерыя...**

— Для мяне важна пакінуць памяць пра сваіх працавітых і сумленных продкаў — род Андроцкіх, пра час маёй маладосці, — тлумачыць сваё памкненне здаваць музейнай установе асабістыя рэчы Неаніла Міхайлаўна. — Мая матуля да вайны вучылася ў тэхнікуме, які размяшчаўся ў будынку ратушы, дзе цяпер і знаходзіцца музей. Таму ратуша для мяне — месца ўспамінаў і памяць пра роднага чалавека.

Неаніла Міхайлаўна па прафесіі медык, доўгі час працавала фельчарам у хуткай дапамозе. А яшчэ яна ліквідатар наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі, яе працоўны стаж — сорак шэсць гадоў. На пенсіі ўзначальвала раённы камітэт Чырвонага Крыжа.

На гэтым здымку Неаніла Шаўцова і яе муж Барыс разам з галоўным хавальнікам музея Людмілай Філюшкінай і старшым навуковым супрацоўнікам Марынай Кузьмянковай выбіраюць экспанаты, якія будуць складаць сямейную выставачную экспазіцыю.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

З нагоды

# ПРАГУЛКІ ПАД КУПАЛАМ

**Учора свой юбілей адсвяткаваў Беларускі дзяржаўны цырк. Яму споўнілася 60 гадоў. За гэты час стварыліся ўласныя цыркавыя дынастыі, былі пастаўлены арыгінальныя аўтарскія нумары, прыдуманы рэдкія трукі. Менавіта цырк вучыць нас, што жыццё любіць смелых, бо пад купалам прагульваюцца толькі тыя, у каго хапіла смеласці адарвацца ад зямлі... Гледзячы на выступленні сучасных артыстаў, разумееш, колькі за гэтай прыгажосцю было трэніровак; здараліся, магчыма, і балючыя траўмы. Але, калі жывая мара, яна дапамагае ўставаць пасля падзенняў і зноў, у святле сафітаў, бляску касцюмаў, выходзіць на арэну.**

На пачатку сваёй гісторыі беларускі цырк існаваў у выглядзе шапіто. Артысты выступалі ў вялізнай палатцы, куды збіраліся шматлікія гледачы, якія хацелі ўбачыць памежныя магчымасці чалавечага цела, палюбавацца на дрэсіраваных звяроў. Пазней з'явілася ідэя займець свой уласны будынак. Аднак гэтаму намеру не наканавана было спраўдзіцца адразу — пачалася Другая сусветная вайна. Падчас адной з бамбёжак снарад трапіў у будынак цырка. Артысты, каб ўратаваць, марскіх ільвоў, вымушаны былі выпусціць іх у раку Свіслач, што цякла побач...

Аднак неўзабаве надышло мірнае жыццё, разам з ім вярнуўся і цырк. Інспектар манежа, вядучы праграмы з асаблівым пафасам аб'яўляў усе нумары. У той час у цырку сярод іншых выступалі і казахскія акрабаты.

Варта адзначыць, што савецкія цыркавыя артысты агулам былі надзвычай папулярнымі ва ўсім свеце. А савецкая цыркавая школа была адной з самых моцных — канатаходцы, жанглёры, акрабаты, клоўны — усе яны атрымлівалі найвышэйшыя ўзнагароды на міжнародных цыркавых конкурсах і фестывалях.

У 1959 годзе нарэшце было скончана ўзвядзенне стацыянарнага будынка Беларускага дзяржаўнага цырка ў Мінску, і ён гасцінна адчыніў свае дзверы. З'явіўся свой «цудоўны дом». Дом, у якім цягам многіх гадоў будзе гарэць святло, будуць чуваць воклічы захаплення, крыкі «брава» і бясконцыя апладысменты. Вядома, у «цудоўны дом» будуць спяшацца артысты з усяго свету, каб здзівіць беларускага гледача сваім мастацтвам.

З тых часоў у беларускім цырку адбывалася шмат розных галавакружных прэм'ер. Адна з іх была прадстаўлена гледачу і сёлета, спецыяльна да юбілею. «Паветраныя гімнасткі на трапецыі» Настасся Дончанка і Настасся Пуцята пад купалам цырка былі нібы адно цэлае. Іх гібкасці, лёгкасці, грацыёзнасці можна толькі здзіўляцца і, вядома ж, захапляцца гэтым.

«Цудоўны дом» — менавіта так называецца, юбілейная праграма цырка ў Мінску. У ёй усё як раней — і марскія львы, і акрабаты з Казахстана, і айчынныя гімнасты, ад нумароў якіх захоплівае дух. Паглядзеўшы гэтую праграму, можна крыху паглыбіцца і ў саму гісторыю відовішчнай установы.



Спецыяльна да 60-годдзя цырка народны артыст Беларусі Міхаіл Скорыкаў і Ніна Жукоўская прэзентавалі новую песню, якая так і называецца — «Цырк»!

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Сваімі словамі



# ЦІ ДАСЯЖНЫ РАЙ?

**Адной з кніг, прадстаўленых на XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, быў твор звяздоўца Уладзіміра Хількевіча «Затрымацца ля варотаў раю» выдавецтва «Четыре четверти». «Раман пра любоў у навелах» — так характарызуюць кнігу яе ўкладальнікі. Аднак, прачытаўшы выданне, пачынаеш думаць, што каханне — не зусім тое, што мы прызвычаіліся пра яго думаць...**

Кніга захапіла мяне з самага пралога. Чытаеш — і яскрава ўяўляеш сваю ўласную знаёмую вясковую бабулю Маню. Адзінокую, да якой няма каму завітаць. Вось стаіць яна, у пацёртым кажушку, стаптаных ботах, хустцы, нацягнутай на вочы. Адна-адзінюткая — і ў той жа час не адна, бо разам з ёй, над ёй, космас і зоры. І нястомны вецер у пасмах валасоў, што выбіліся з-пад завязанай яшчэ зранку хусткі; нябачнае цяпер сонца — якое паспела шчодра пазалаціць яе спрацаваны твар. Баба Маня пра наваколле і суладдзе з ім ведае нашмат больш, чым усе мы, гарадскія жыхары XXI стагоддзя. І нават крышачку-злёгку зайздросціцца ёй: яе свабодзе і спалучанасці з касмічна-зорнай прасторай. Зайздросцілася б, каб не падсвядомае адчуванне татальнай пакінутасці і болю, што прыгняздзіліся глыбока на дне яе сэрца. Праўда, яна і не пакутуе ад іх надта. Бо проста не ведае, як можа быць іначай.

Розніца ў тым, што галоўную гераіню кнігі завуць не Маня, а Васілінка. І што яна зусім не адзінокая, а мае пяць дзяцей, якіх гадуе — і выгадавала сама!

Пэўны парадокс кнігі, які кідаецца ў вочы амаль усім чытачам, заключаецца ў тым, што яна напісаная на рускай мове, але пры гэтым на сто працэнтаў з'яўляецца кнігай пра нашу вёску, дзе, як вядома, карыстаюцца беларускай мовай. Часта аўтар наўмысна пакідае ў гутарцы герояў тутэйшыя, мясцовыя словы, не ў змозе вырваць гэтыя сакавітыя, яскравыя парасткі з агульнай тканкі твора.




Мяркую, кніга будзе цікавая як тым, хто ведае штосьці пра беларускую вёску — вырас там, прыязджае на лета, стала жыве, — так і тым, хто пра вёску нашу не ведае зусім нічога, але даведацца хоча. Гэта разгорнуты атлас, даведнік, вароты ў рай — гартайце, чытайце, спазнавайце, што такое беларуская вёска. Пазнавайце ў ёй сябе, замілоўвайцеся ці імкніцеся дыстанцыявацца — уласную ролю зразумееце самі.

Вельмі цікава было б даведацца, адкуль узяў аўтар звесткі пра ўсе звычаі, традыцыі, песні? Ці сам перажываў, бачыў? Ці вось так, па драбнічках, збіраў з розных крыніц народны фальклор, каб потым увасобіць у сапраўднай энцыклапедыі вясковага жыцця.

Кніга, натуральна, складаецца не з адных традыцый. Як і праанансавана ў падзагалоўку, дзе напісана пра любоў у навелах, тут шчыльна пераплецены драматургіі лёсаў розных людзей. На авансцэне твора не толькі Васілінка, але і ўсе яе дзеці — кожны па чарзе ў прысвечаным яму раздзеле, — і муж Адам. Ці сустрэлі яны каханне? На гэта пытанне няма дакладнага адказу. Аднак відавочна, што яны па-свойму шукалі шчаслівай долі, хоць бы на частцы адмеранага шляху выбудоўвалі адносіны з меркаванымі палавінкамі. Тут каханне, не выказанае словамі, не відавочнае, пачуццё, хутчэй, насуперак, чым дзякуючы. Можа, у гэтым яго характэрнасць і для многіх іншых беларусаў? Бо ў нас часта не прынята гаварыць пра добрае, на словах падтрымліваць адно аднаго, выказваць шчырасць і падтрымку.

Пакручастая лінія драматургіі пайшла так, што ў выніку атрымаўся твор пра... не вельмі шчаслівых людзей. Так, Васілінка здолела падняць сваіх пяцярых дзяцей, выгадаваць, нягледзячы на ліхалецці XX стагоддзя. Ці была яна шчаслівай? Парадокс у тым, што пра гэта неяк не прынята было думаць.

Асабіста для мяне тут вельмі рэзануе, што і мае сваякі, якія жылі ў тыя часы і пазней расказвалі пра іх, не лічылі сябе шчаслівымі... «Сталін пракляты вывозіў нас у Сібір», — вось што зусім нярэдка чую я ад іх. «А потым мы разжываліся, па адным паленцы з лесу вазілі на хату. Ох, як было трудна...»

Аўтару важна аналізаваць час, і не толькі наш, а і той, які ўжо адышоў і палягае ў падмурку сучаснасці. З гэтай задачай Уладзімір Хількевіч выдатна справіўся. Дзякуй за шчырасць. І за магчымасць зірнуць на нас усіх збоку, прычым праўдзіва.

У сярэдзіне твора крыху бракуе дынамікі. Аўтар роўна апавядае пра лёсы розных дзяцей Васілінкі — і чытач ужо амаль гатовы страціць да іх цікавасць. Бо і сам ведае нямала такіх лёсаў. Цудоўнай кульмінацыяй твору з'яўляецца атрыманне Васілінкай ліста ад мужа, у смерць якога яна адна ніколі не верыла... Значыць, жывы. Ён піша — пасля бяздонных вечароў і начэй яе чакання, — і як цяпер гэта вытрымаць? Каб дадаць у кнігу яшчэ некалькі момантаў, дзе напружанне рэзка ўзрастае, твор стаў бы яшчэ мацнейшым. Прыгадваецца хіба што выпадак, калі Васілінка ледзь-ледзь паспела ўратаваць свайго сына, каб пан не адсек яму руку за тое, што той узяў крыху кашы з агульнага катла, — выкупіла яе... каштоўным поясам. І як на базары яшчэ адно яе дзіця мінакі збілі па твары мокрай рыбай — за крадзеж. Такая рэальнасць. Такія лёсы.

Я заўсёды радуюся, калі з'яўляецца яшчэ адна кніга пра нашу з вамі Беларусь. Такую, якая яна ёсць, без прыкрас і дадумак. І тады, нават калі здарыцца сусветны патоп ці пажар, але ацалее хоць бы адзін асобнік — людзі, якія прыйдуць пасля, якія не бачылі яе такой, даведаюцца. І, можа быць, палюбяць. «Затрымацца ля варотаў раю» — акурат вартае гэтай задачы выданне. Дзякуй аўтару за праўдзівы летапіс культуры, атмасферы і лёсаў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, фота аўтара.**

Трапіць у цэль

# «СНЕЖНЫ СНАЙПЕР» ЯК СТАРТ ДЛЯ ТАЛЕНТАЎ

**Рэспубліканскія спаборніцтвы па біятлоне адкрылі вялікі гарачы люты ў Раўбічах. Менавіта тут у выходныя прайшоў фінальны этап турніру «Снежны снайпер»: 168 школьнікаў з усёй Беларусі ад 11 да 16 гадоў — для хлопцаў і дзяўчат гэта маленькая Алімпіяда стала галоўнай падзеяй года.**




На лыжні ўсё па-даросламу: каб трапіць у фінал «Снежнага снайпера», юныя спартсмены прайшлі некалькі этапаў на школьных і раённых спаборніцтвах, потым — на абласных. Такім чынам, у Раўбічах мы ўбачылі прадстаўнікоў з усіх абласцей краіны, у гэтыя дні іх увага была сфакусавана на дыстанцыі і агнявых рубяжах. А вось на трыбунах кіпелі эмоцыі, падтрымаць спартсменаў прыехалі балельшчыкі не толькі з Мінска.



За трынаццаць гадоў існавання турніру ён дапамог адшукаць дзясяткі таленавітых спартсменаў, а галоўнае — паставіў на лыжы сотні беларускіх школьнікаў. Некаторым «Снежны снайпер» даў пуцёўку ў вялікі спорт, бо па выніках толькі мінулага года паўсотні ўдзельнікаў былі адабраны і пратэсціраваны трэнерамі, а чацвёра з іх сёння залічаны ў спецыялізаваныя біятлонныя школы.

*«Найлепшая ацэнка нашай працы — станоўчыя водгукі гледачоў. Людзі прыязджаюць загадзя да гонак і шчыра хварэюць за сваіх спартсменаў, а юныя стралялючыя лыжнікі, у сваю чаргу, эмацыянальна завяршаюць выступленні,* — адзначыў у час размовы з журналістамі **памочнік старшыні Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Павел ЯГОРАЎ.** — *Для многіх гэтыя спаборніцтвы стануць пуцёўкай у вялікі спорт, але нават калі дзеці і не звяжуць сваё жыццё з біятлонам, уражанні ад «Снежнага снайпера» застануцца з імі на ўсё жыццё».* Таксама ён адзначыў, што ў далейшым турнір будзе ўдасканальвацца. Напрыклад, у наступным сезоне плануецца з першага этапу правядзенне біятлонных спаборніцтваў у адзін дзень, а не асобна стральба ў цiры і лыжныя гонкі, як гэта дазволена рэгламентам цяпер. *«Будзем старацца максімальна зацікавіць юных атлетаў»,* — дадаў Павел Ягораў.



Нагадаем, цяпер турнір складаецца з дзвюх дысцыплін — спрынту і змешанай эстафеты, каб адабрацца на другую, трэба добра выступіць у першай.

Сёлета больш за ўсё ўзнагарод сабралі сталічныя спартсмены, іх каманда і стала наймацнейшай у агульнакамандным рэйтынгу, следам ідуць Мінская і Гомельская вобласці. Узнагароджванне пераможцаў і прызёраў правяла чатырохкратная алімпійская чэмпіёнка Дар'я Домрачава. Акрамя кубкаў для юных калег яна падрыхтавала спецыяльныя сюрпрызы — элементы спартыўнай экіпіроўкі, Дар'я пажадала біятланістам далейшых поспехаў у спорце і выказала надзею, што яе падарункі дададуць ім матывацыі. Ну а свае медалі пераможцы і прызёры атрымаюць 18 лютага падчас «Гонкі легендаў», якая і працягне гарачы люты ў Раўбічах.

**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

# Акцэнт на харчовую бяспеку

**Пытанні санітарна-эпідэміялагічнага забеспячэння мультыспартыўнага форуму абмеркавалі на сустрэчы прадстаўнікоў фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» і спецыялістаў санэпідслужбаў рознага ўзроўню.**

Асноўнай мэтай праведзенай дыскусіі было прадставіць работнікам цэнтраў гігіены і эпідэміялогіі максімальна поўную інфармацыю аб Гульнях, спартыўных аб'ектах, працэсе арганізацыі харчавання для кліенцкіх груп і задзейнічаных апаратарах харчавання.

Прэзентацыя Дырэкцыі ўтрымлівала звесткі пра арганізацыю харчавання на ўсіх спартыўных і неспартыўных аб'ектах Гульняў. Пасля адбыўся адкрыты дыялог, падчас якога абмеркавалі пытанні каардынацыі работы зацікаўленых службаў і папярэджання магчымых рызык.

*— Трэба не забываць, што мерапрыемства з'яўляецца мультыспартыўным, таму мяркуецца задзейнічаць шмат аб'ектаў, дзе будзе знаходзіцца шмат людзей, а таксама шмат апаратараў харчавання,* — звярнула ўвагу **начальнік упраўлення па арганізацыі харчавання фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Юлія КРАЎЧАНКА.** — *Менавіта таму сур'ёзны акцэнт робіцца на харчовую бяспеку. Але мы таксама сутыкаемся і з міжнароднымі нормамі, якія неабходна выконваць. Увесь працэс арганізацыі харчавання на Гульнях патрабуе вытрымкі пэўных нарматываў правядзення аналагічных мерапрыемстваў. На цяперашнім этапе ў нас заключаны ўсе дагаворы з асноўнымі апаратарамі харчавання. Калі весці гаворку аб харчаванні спартсменаў, то ўжо ідзе тэсціраванне страў. Таксама тэсціруецца і работа персаналу. У частцы спартыўных аб'ектаў дагаворы з апаратарамі заключаны, меню знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі і адпрацоўкі страў.*

Удзел у сустрэчы прынялі прадстаўнікі цэнтраў гігіены і эпідэміялогіі раёнаў Мінска, спецыялісты Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, якія будуць акрэдытаваны для суправаджэння мерапрыемстваў на спартыўных арэнах і аб'ектах харчавання II Еўрапейскіх гульняў. Як адзначыла **галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Мінска Нэлі ГІНДЗЮК**, санітарна-эпідэміялагічная служба беларускай сталіцы мае вялікі досвед забеспячэння і суправаджэння масавых мерапрыемстваў.

*— Зараз вельмі важна «зверыць гадзіннікі», каб выразна весці работу не толькі на асноўным аб'екце харчавання ў Вёсцы спартсменаў, але і па аб'ектах харчавання на ўсіх спартыўных аб'ектах, дзе будуць знаходзіцца прадстаўнікі розных кліенцкіх груп, удзельнікі і госці мерапрыемстваў,* — падкрэсліла Нэлі Гіндзюк . — *Санітарна-эпідэміялагічнай службай Мінска сумесна з Дырэкцыяй распрацаваны ўсе неабходныя планы, праводзіцца гігіенічнае навучанне персаналу, які будзе займацца падрыхтоўкай ежы для патрэб Гульняў. Акрамя таго, абследаваны пастаўшчыкі прадукцыі, адабраныя пробы, праводзіцца маніторынг усіх гэтых аб'ектаў. Таксама арганізаваны маніторынг месцаў пражывання, харчавання і ў цэлым усіх месцаў масавага знаходжання гасцей і жыхароў сталіцы.*

Удзельнікі сустрэчы вызначылі далейшую стратэгію мерапрыемстваў па санітарна-эпідэміялагічным забеспячэнні II Еўрапейскіх гульняў.

# НАСУСТРАЧ АЎСТРАЛІІ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра матч Кубка Федэрацый і іншыя самыя прыкметныя навіны выхадных.**

**1.** ***Тэнісісткі зборнай Беларусі выйшлі ў паўфінал Кубка Федэрацый. У Браўншвайгу беларускі абыгралі зборную Германіі з сухім лікам 4:0.*** Вырашальнае ачко ў гасцявым чвэрцьфінальным матчы прынесла лідар зборнай Арына Сабаленка, якая абыграла Лауру Зігемунд — 6:1, 6:1.



Нагадаем, у першы дзень спаборніцтваў Арына Сабаленка перамагла Андрэа Петкавіч — 6:2, 6:1, а Аляксандра Сасновіч была мацнейшай за Тацццяну Марыя — 7:6 (7:3), 6:3. У парным паядынку Лідзія Марозава і Вікторыя Азаранка абыгралі Ганну-Лену Гронефельд і Мону Бартэль.

У паўфінале наша зборная сустрэнецца з камандай Аўстраліі на яе пляцоўцы, сустрэча пройдзе 20—21 красавіка. Адзначым, што зборныя Беларусі і Аўстраліі яшчэ ні разу не сустракаліся ў матчах Кубка Федэрацый. Другую паўфінальную пару склалі зборныя Францыі і Румыніі. Французскія тэнісісткі ў 1/4 фіналу перамаглі на выездзе Бельгію — 3:1, а румынкі таксама ў гасцях перайгралі чэшскую каманду з лікам 3:2.

**2.** ***Беларускія велагоншчыкі з каманды «Мінск» атрымалі тры перамогі на шашэйных спаборніцтвах у Турцыі.*** Таццяна Шаракова заняла першае месца на «Гран-пры Аланіі». У іншым старце "Гран-пры Газіпаша" беларуска Іна Савенка першай перасекла фінішную рысу. У спаборніцтвах сярод мужчын у гэтай гонцы найлепшым быў беларус Бараніслаў Самойлаў. Яўген Каралёк, які выступаў за зборную Беларусі, стаў уладальнікам сярэбранай узнагароды ў мужчынскай гонцы на «Гран-пры Аланіі».

Наймацнейшыя беларускія веласіпедысты працягнуць падрыхтоўку да шашэйнага сезона ў Турцыі, а затым вернуцца ў Мінск і будуць рыхтавацца да чэмпіянату свету па веласпорце на трэку, які з 27 лютага стартуе ў польскім Прушкаве.

**3.** ***Валейбалісткі «Мінчанкі» прайгралі «Уралачцы» з лікам 2:3 у 16-м туры чэмпіянату Расіі ў суперлізе.*** У бягучым сезоне абедзве каманды сустракаліся ў Екацярынбургу, у першым крузе чэмпіянату «Уралачка» на дамашняй пляцоўцы 1 снежня 2018 года была мацнейшая з лікам — 3:1. У мінулым сезоне «Мінчанка» двойчы абыграла ўральскі клуб у Кубку ЕКВ на стадыі чвэрцьфіналу (3:1, 3:0).

Чарговы матч у расійскай суперлізе беларускі клуб правядзе на выездзе 16 лютага супраць чэлябінскага «Дынама-Метар».

**4.** ***Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова прайграў у 11-м туры групавога этапу Лігі чэмпіёнаў французскаму «Манпелье» з лікам 23:29.*** Свой наступны паядынак у групе А Лігі чэмпіёнаў БГК правядзе 16 лютага на сваёй арэне супраць нямецкага клуба «РайнЛевен». Турнірнае становішча ў групе А пасля 11 гульнявых дзён: «Барселона» — 18 ачкоў, «Вардар» — 15, «Візэ» — 14, «Веспрэм» — 14, «РайнЛевен» — 12, БГК — 5, «Манпелье» — 5, «Крысціянстад» — 5. У плэй-оф ЛЧ выйдуць шэсць найлепшых камандаў.



**5.** ***Гандбалісты магілёўскага клуба «Машэка» прайгралі ў першым матчы 1/8 фіналу еўрапейскага Кубка выкліку бельгійскаму «Візэ» з мінімальнай розніцай у ліку — 31:32.*** Зваротны паядынак за выхад у чвэрцьфінал адбудзецца 17 лютага ў Бельгіі. Раней у жаночым Кубку выкліку гандбалісткі «Гомеля» выйшлі ў 1/4 фіналу, двойчы абыграўшы ў сябе дома харвацкі клуб «Кока» з Вараждзіна — 30:18 і 32:23.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

**УП «Белконфискат»
объявляет о проведении электронных торгов
15.03.2019 г. по продаже имущества,
изъятого у Лапшина П. А.**

Легковой джип «Мицубиси Аутлендер», 2008 г. в., начальной стоимостью 11 400 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

**ОАО «ЭнКоСтрой» (г. Минск, ул. Монтажников, 39-201)
проводит очередное общее собрание акционеров
ОАО «ЭнКоСтрой» в очной форме 15 марта 2019 г.
в 12.00. Место проведения собрания:
ОАО «ЭнКоСтрой», г. Минск, ул. Монтажников, 39 к. 208**

Повестка дня собрания:

